Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

КАСТРЫЧНІК 28 1933 г. СУБОТА № 238 (4782)

Год выдання XVII

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

СЕННЯ У НУМАРЫ:

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ—На зяблеве заваёўваецца ўраджай будучага года. Т. СЯКЕРСКІ—Комсамол Полышчы вучыцца ў УсеЛКСМ змагацца і перамагаць.

НАРЫС: П. ШАСТАКОЎ—Парашутыст.

Сустрэць XVI гадавіну Кастрычніка поўнай ліквідацыяй брака—пачэсная задача швэйнікаў фабрыкі «Кастрычнік».

Забяспечыць штодзённае аперацыйнае кіраўніцтва школамі.

ЗАВАЯВАЦЬ ПРАВА НА МЕСЦА Ў КАСТРЫЧНІЦКАЙ КАЛГАСНАЙ КАЛОНЕ.

За МЯЖОЙ.

СОВЕЦКАЯ ДЭЛЕГАЦЫЯ НА ЧАЛЕ З ТАВ. ВАРАШЫЛАВЫМ ПРЫБЫЛА Ў ТУРЦЫЮ.

Неадкладна і поўнасцю завяршыць зяблёва

Сваячасова і добра зазяблены клін—крок да калгаснай заможнасці

НА ЗЯБЛІВЕ ЗАВАЕЎВАЕЦЦА ЎРАДЖАЙ БУДУЧАГА ГОДА

Калгас «УЛЬЯНАВА», Лешнянскага сельсовета, Капыльскага раёна, зняў у гэтым годзе самы высокі ўраджай. Ульянаўцы атрымалі ў сярэднім з кожнага гектара па 20 цэнт. жыта, 19 цэнт. азімай пшаніцы, 19,5 цэнт. ячменя і 160 цэнт. бульбы.

Сям'я ўдарніка гэтага калгаса Сямашкі Алеся, былога бедняка, атрымлівае зараз за сваю работу 140 ПУДОЎ ЖЫТА, 70 ПУД. ПШАНІЦЫ І 140 ПУД. ЯРАВЫХ і 570 ПУД. БУЛЬБЫ.

На прыкладзе гэтага калгаса мы бачым, як былыя беднякі і сераднякі, сумленна выконваючы заветы правадыра нашай партыі т. СТАЛІНА, у калгасе падымаюцца да ўзроўня заможнага і культурнага жыцця.

Ульянаўцы дабіліся гэтага ўпартай барацьбой за высокі ўраджай, за перадавую агратэхніку. Яшчэ летась ва Ульянаве зразумелі, што БАРАЦЬБА ЗА УРАДЖАЙ ПАЧЫНАЕЦЦА З ВОСЕНІ. Азімая сяўба была праведзена У РАННІЯ ТЭРМІНЫ, ПА ДОБРА ЎГНОЕНАЙ ГЛЕБЕ. БЫЎ ПОЎНАСЦЮ ВЫКАНАН ПЛАН ЗЯБЛІВА. Гэта аблегчыла калгасу вясной правесці сяўбу ў вызначаныя партыяй і ўрадам тэрміны і добраякасным, ачышчаным гатунковым насеннем, па добра падрыхтаванай глебе. Пры ўборцы не страцілі ні аднаго коласа.

Але ўльянаўцы на гэтым не спыняюцца. Яны паставілі перад сабой задачу: ЗНЯЦЬ У БУДУЧЫМ ГОДЗЕ ЯШЧЭ БОЛЬШ ВЫСОКІ ЎРАДЖАЙ, ЗАВАЯВАЦЬ ЯШЧЭ БОЛЬШ ВЫСОКІ ДАХОД. Словы ў іх не разыходзяцца са справай. Калгас «Ульянава» і ў гэтым годзе сеячасова і ўзорна засеяў 85 га азімых, у тым ліку 40 га пшаніцы, і зазяблю 72 гектары. Зараз па зяблеве пускаюцца пружынныя бораны, уплойваецца і паўторна ўзорваецца плошча пад бульбу.

На прыкладзе калгаса «Ульянава» мы бачым, якія велізарныя магчымасці заключае ў сябе калгасны лад, планавая калгасная гаспадарка, якіх вынікаў можна дабіцца пры сумленных адносінах да калгаснай працы, да калгаснага дабра.

Фактычна зараз на асенняй сяўбе і ўздыме зяблёва закладваюцца асновы ўраджаю будучага года.

Таму важнейшай задачай работнікаў соцыялістычнага земляробства, усіх партыйных арганізацый з'яўляецца — узняць на новую ступень барацьбу за якасць апрацоўкі глебы, за тэрміны зяблёва.

У нас ёсць усе магчымасці забяспечыць у будучым годзе ўраджай большы, чым сёлета і ўжо зараз стварыць умовы для лепшага і больш арганізаванага правядзення веснавой сяўбы 1934 года, чым гэта было мінулай вясной.

Аднак, практыка паказвае, што не ўсе раённыя арганізацыі, не ўсе саўгасы, калгасы і МТС скарыстоўваюць, як слід, гэтыя магчымасці. Лепш за ўсё аб гэтым сведчыць ход зяблёва. Па БССР на 20 кастрычніка пад зяблёва ўзята ўсяго 35,2 проц. намечанай плошчы.

Рад раёнаў, як ЛЕПЕЛЬСКІ, УШАЦКІ, БЕШАНКОВІЦКІ, ЧАШНІЦКІ, ЛЕЗНЕНСКІ, СІРОЦІНСКІ, ЧЫРВОНАПОЛЬСКІ, УВАРАВІЦКІ І БРАГІНСКІ толькі зараз пачынаюць зяблёў. У гэтых раёнах план зяблёва выканан усяго ад 5 да 15 проц.

Кіраўніцтва гэтых раёнаў не здолела спалучыць усіх асенніх сельска-гаспадарчых работ з выкананнем плана зяблёва. На зяблёве глядзяць, як на другарадную справу.

Калі гаварыць аб прычынах адставання з узорваннем пад зяблёва, дык перш за ўсё трэба сказаць аб рабоце трактарнага парка. Толькі незначная частка трактарнага парка сапраўды знаходзіцца на ворыве. А тыя трактары, якія заняты на ворыве, з прычыны адсутнасці паліўнага рамонта, тэхнічнага кіраўніцтва і штодзённага нагляду за скарыстаннем машын і людзей, больш стаяць, чым працуюць, не даюць і паносы сваёй прадукцыйнасці.

Возьмем для прыкладу КЛІМАВІЦКІ раён. План зяблёва выкананы на 20 кастрычніка ўсяго на 24 проц., у тым ліку калгасамі — на 21 проц. Трактарны парк скарыстоўваецца выключна дрэнна. Трактары ўзаралі не больш 15 проц. вызначанай для іх плошчы. За 10 дзён кастрычніка трактарная брыгада № 2 мела 130 гадзін прастоя, а брыгада № 7 —584 гадзіны прастоя. Характэрна, што большасць прастояў адбываецца з прычыны дробных тэхнічных непаладак, прагулаў трактарыстаў і нядбайнага кіраўніцтва работай трактароў з боку апарата МТС.

Зусім нездавальняюча скарыстоўваецца трактарны парк і ў саўгасах. Саўгасы менскага Малакапрамтэраста выканалі план зяблёва ўсяго на 24 проц. Дырэкцыя і пасобныя саўгасы спасылаюцца на тое, што зараз не хапае газы. У той-жа самы час рад саўгасаў усю восень вазілі трактарамі гной на палі, перавозілі трактарамі ўсякія грузы, а капі справа дайшла да зяблёва, не хапіла газы. Ёсць саўгасы, якія месячны запас газы выдаткоўваюць за тыдзень.

Фактычна ні ў адным трэсце няма ўліка скарыстання трактараў і выдаткавання гаручага. Няма такога-ж уліка і ў саўгасах. Кіраўніцтва работай трактараў ідзе ўсляпую. Гэта прыводзіць да бясконцых прастояў, паломак, аварый і нізкай прадукцыйнасці.

Другой прычынай зрыва зяблёва з'яўляецца няправільнае скарыстанне конскай цягавай сілы. У ЕЛЬСКІМ раёне, напрыклад, зазяблена ўсяго 38,5 проц. вызначанай плошчы. Між тым, у многіх калгасах коні гуляюць, а калгаснікі капаюцца на сваіх празмерна раздутых прысядзібных участках. Рад сельсоветаў замест рашучай барацьбы з апартуністычнай недаацэнкай і ігнараваннем зяблёва стаў на шлях ашуканства партыі і грамадзянскасці, шляхам дасылкі ілжывых, не адпавядаючых сапраўднасці зводак аб ходзе зяблёва.

Як рэагуюць на гэта вельскія раённыя арганізацыі, райземаддзел у першую чаргу? Апарат райзя фактычна штампуе хлусівыя зводкі і гэтым патурае арыўшчыкам зяблёва.

У БАБРУЙШЧЫНЕ зяблёва зацягваецца, між тым конская цягавая сіла таксама не скарыстоўваецца. Калгас «ЧЫРВОНАЯ ЦЕСА» са 150 гектараў не ўзараў пад зяблёва ні аднаго га. У калгасе прабуюць апраўдвацца тым, што «ўсе заняты на бульбе». У сапраўднасці-ж пры праверцы выявілася, што ў калгасе штодзённа гуляе без работы 8 калгаснікаў і 10 коняй. З гэтай рабочай і цягавай сілай штодзённа пры сярэдняй нагрузцы можна ўзорваць не менш 5 гектараў. «Чырвоная Цеса» не выключэнне. У калгасе «ЧЫРВОНАЯ БУДА», уборка бульбы скончана, але тут усю рабочую сілу пераключылі на мапацьбу, махнуўшы на зяблёва рукой. У выніку 85 гектараў не ўзораны.

ЦК КП(б)Б у сваёй пастанове даў зусім канкрэтную і ясную дырэктыву ўсім раённым партыйным арганізацыям, дырэктарам саўгасаў, МТС і праўленням калгасаў: ДА 1 ЛІСТАПАДА ПЛАН ЗЯБЛІВА ВА ШТО-Б ТАМ НІ СТАЛА ПАВІНЕН БЫЦЬ ВЫКАНАН. Для гэтага ёсць усе магчымасці.

МТС і саўгасы павінны неадкладна пераключыць на зяблёва не менш 82 проц. трактараў і дабіцца максімальнага іх скарыстання.

У кожным калгасе і саўгасе павінны быць неадкладна створаны спецыяльныя звенні для ўзорвання пад зяблёва з вызначэннем поўных заданняў кожнаму звяну.

Разгортваючы барацьбу за сеячасовае скончэнне зяблёва, высокай якасцю работ забяспечым новы ўздым ураджайнасці і яшчэ большыя перамогі ў ажыццяўленні позыўнага тав. СТАЛІНА аб калгасная заможнасці.

ЗАВАЯВАЦЬ ПРАВА ЎДЗЕЛА У КАСТРЫЧНІЦКІХ СВЯТАХ У МЕНСКУ

СПАБОРНІЦТВА БРЫГАД У КАЛГАСЕ „ТРУДАВІК"

ТОРМАЗЫ ЗЯБЛІВА

ЛІСТ ПЯТЫ

ЛЕЗНА (ад нашага спецыяльнага карэспандэнта).

Брыгада тав. МІНЧАНКІ па зяблёву ўвесь час ішла наперадзе. Ужо ўзарана 20 гектараў. Звяно аратых Патапенкі і Красоўкіна выклікала на соцыялістычнае спаборніцтва звяно Боўкава і Іванова. У спаборніцтва за права пасцяць дэлегата на Кастрычніцкае свята ў Менск уключаецца кожны калгаснік.

А 22 і 23 кастрычніка ў брыгадзе Мінчанкі па зяблёва не выехала пераводная парка коняй. Чаму? Адзін дзень работы, праба проста сказаць, сарваны вытворчым участкам МТС. 6 першай брыгадай калгаса «Трудавік» па распараджэнні загадчыка вытворчага ўчастка т. Ондрушка паслалі 6 коняй у калгас «Бязбожнік» за лаўскладаным малатарняй. Патрацілі дзень і не знайшлі брыгадзіра Лахваенка, які павінен быў выдаць машыну. Вярнуліся з пустымі рукамі.

23 кастрычніка зноў паслалі гэтых людзей за малатарняй і, нарэшце, прывезлі яе. Два дні работы або каля 5 гектараў зяблёва страчана. Упушчанае трэба пагашаць. Брыгадзір Мінчанка не дуе адаць пярэшта ў соцыяборніцтве, хоць яго і даганяе раней аставаўшая на зяблёве брыгада № 2.

Мы ўжо паказвалі ў папярэдняй карэспандэнцыі, чаму адставала гэтая брыгада (брыгадзір Цыганкоў Трахім) — тут былі няправільна расстаўлены сілы, не было здзельчынны, не наладжан улік.

Зараз, парады і рэзкая крытыка работы брыгадзіра Цыганкова Трахіма з боку начальніка аддзела МТС тав. ДАНЦЫГЕРА не прайшлі бясследна. Цыганкоў падцягнуўся, падцягнулася і брыгада ў цэлым, зяблёва ўзнята 16,05 гектараў, апошнія дні штодзённа працуе 12 коняй.

Зразумеў брыгадзір Цыганкоў Трахім і яго брыгада, што ацэнка працадня калгаснікаў брыгады будзе залежаць ад поспеха вакансіўнія ўсіх асенніх сельска-гаспадарчых работ і выканання абавязацельстваў перад дзяржавай.

Вось чаму Цыганкоў катэгарычна запрабуе ад праўлення, каб вярнулі яму парку коняй, якая была часова перадана першай брыгадзе месяцы два таму назад:

— Не хачу быць апошнім, не хачу, каб маёй брыгадзе ўпісвалі ацэнку працадня за адставанне. Мы можам быць першымі — гаворыць Трахім.

Верна: разгарнуўшы яшчэ шырэй соцспаборніцтва ў брыгадзе, Цыганкоў Трахім можа заваяваць пярэшта.

На зяблёве, напрыклад, у брыгадзе № 2 ударнікі-калгаснікі Казакоў Ягор і Іван і Голубеў Пётра ўзворваюць за дзень 0,63 гектара. А гэтую норму можна павялічыць, арганізаваўшы яшчэ раней выхад на работу.

Першая і другая брыгада (брыгадзіры Мінчанка і Цыганкоў Т.) сапраўды змагаюцца за пярэшта ў калгасе наогул і па зяблёву — у прыватнасці.

Рэкорд наўмення арганізаваць работу на зяблёве паказвае брыгадзір 3-ей брыгады Салаўёў Пархвен.

23 кастрычніка, раніцою, а 8 гадзіне, мы са старшынёй калгаса Пётрам Салаўёвым, навесцалі другую брыгаду. Там даўно працуюць, аратыя даўно на полі.

А 9 гадзіне ў центры брыгады адзін брыгадзір Салаўёў Пархвен, пры ім пара коняй без аброщай ядуць авёс. Калгаснікаў не відаць.

Дзе-ж людзі? пытаем.

— Хто снедаць пашоў, хто з вечарыны яі заспаўся, — адказвае брыгадзір.

Праз якія 10 мінут да брыгадзіра падехаў калгаснік Сапаўёў Рыгор, малады хлапец. У яго пара коняй, едзе на ворыва зяблёва.

— Чаму так позна? — пытаем.

— З дзяўчатамі позна валаводзіўся, — з усмешкай адказвае ён і навольна едзе далей.

Яшчэ праз 10 хвілін да брыгадзіра бяжыць... конь, за канём сунецца калгаснік Цыганкоў Сцяпан.

— Што за камедыя? — пытаем брыгадзіра.

— А хто яе ведае? — напуга адказвае брыгадзір.

Аказваецца: у аратага ў Сцяпана адзін конь запрэжан у плуг, а другі пайшоў да брыгадзіра... за аўсом. Смех на, але гэта так: сам брыгадзір збірае раніцой з усіх канцоў коняй у центр (коні стаяць у калгаснікаў, бо стайня занята абожжам) і корміць іх тут. Нічога разумнейшага прыдумаць не мог.

Так выходзяць на работу ў 3 брыгадзе. Брыгадзір пінаваціць калгаснікаў, кажа: «не ўлухаюць». Гэта няправільна: брыгадзір Салаўёў не кіруе брыгадай, а проста сочыць за тым, хто куды і калі хоча ідзе. Карацей кажучы, не брыгадзір, а мокрая курыца.

Прыведзеныя два прыклады — не выпадковасць, а сістэма. Сам Салаўёў прызнаецца — калгаснікі Акупёвы Андрэй і Іван прыдуць, пакажуцца і, не пачынаючы працы, ідуць... снедаць. А працадні патрабуюць.

Брыгадзір піша працадні, а за што — і сам не разумее. Не запісаць, скінуць некалькі працадзён за дрэнную працу некаторых калгаснікаў не рашаецца, а ўсё гэта выклікае нарэшце неабходнасць спісаць усёй брыгадзе ад 10 да 20 процантаў агульнай колькасці працадзён за дрэнную работу.

Чацвертая брыгада — брыгадзір Цыганкоў Раман.

— Колькі параж на зяблёве — пытаем.

— Усяго 3 паркі.

— Чаму?

— Людзей няма, — завучаны, пазаменны, штодзённы адказ.

Тут-жа дае ідзе гутарка—перабіраюць бульбу. Малады хлапец Мацкевіч Уладзімер стаіць пры фурманцы, час ад часу бярэ ад перабіральшчыц конык з бульбай, высыпае ў калёсы і зноў стаіць.

— А ці-ж нельга Мацкевіча паслаць на зяблёва? Калгаснікі за 15 крокаў самі падвязуць бульбу да склепа! — прапанавалі мы брыгадзіру.

Аказалася: можна, але...

— Плугоў няма, — заявіў брыгадзір.

— Як няма, а вось каля пас стаяць 2 плугі «Сакка», праўда, паржавеўшыя, неадрэмантаваныя, — здзівіліся мы.

— Яны ёсць, толькі... не любім мы іх,—выкручваецца зноў Цыганкоў.

Аднак пасылае Мацкевіча на зяблёва. Той з ахвотай ідзе працаваць і, аказваецца, за адвячорак узняў 0,18 гект. Пекапаўмыся, можна знайсці яшчэ пару-другую такіх, як Мацкевіч, што скарыстоўваюцца нерацыянальна.

Як і трэцяя, чацвертая брыгада таксама — кандыдат на зніжэнне ацэнкі працадня, кандыдат на чорную дошку ў соцспаборніцтве брыгад.

А. МІКУЦКІ.

ЛЕЗНА, 24-X—33 г.
калгас «Трудавік».

Ураджай будучага года забяспечан

Калгас «Ульянава», Лешнянскага сельсовета (Капыльшчына), зняў у гэтым годзе самы высокі ўраджай у раёне. З аднаго гектара ўльянаўцы ў сярэднім атрымалі 27 цэнтнераў жыта, 19 цэнтнераў азімай пшаніцы, 19,5 цэнт. ячменя і 160 цэнт. бульбы.

Сям'я ўдарніка СЯМАШКІ АЛЕСЯ атрымлівае ў гэтым годзе 140 пудоў жыта, 70 пудоў пшаніцы, 570 пудоў бульбы і 140 пудоў іншых яравых культур. Ульянаўцы сапраўды становяцца заможнымі.

Такіх вышкаў калгас дабіўся сеячасовым і добраякасным правядзеннем сяўбы і ўборкі. Сяўба была праведзена ў калгасе ва ўстаноўленыя картыяй і ўрадам тэрміны чыстагатунковым насеннем. Ворыва і баранаванне была праведзена без апрохаў. Пры ўборцы не згублена ні аднаго коласа.

Але ўльянаўцы на гэтым не спыняюцца, яны мяркуюць атрымаць у будучым годзе яшчэ больш ураджай. Калгас заселў у тэрмін 85 га азімых і зазяблю 72 га. Зяблёва было праведзена адразу пасля звозкі вазоў з поля. Цяпер калгас мяркуе пусціць па зяблёву спрэчкавыя бораны, угноіць і паўторна ўзараць 15 га пад бульбу.

В.

ПАЎТАРЭННЕ ЛЕТАШНЯЙ ПАМЫЛКІ

У БАБРУЙСКУ ІГНАРУЮЦЬ ЗЯБЛІВА

БАБРУЙСК. (Наш кар.).

Летась у Бабруйскім раёне план зяблёва быў праваленны. Вясною многія калгасы сёлі ў аднавор, сяўба зацягнулася. Гэта, зразумела, адбілася на ўраджайнасці. Напрыклад, у калгасе «НОВЫ ШЛЯХ» з кожнага гектара не дабралі па паўтары тоны бульбы, а разам каля 100 тон. На жаль, гэтыя ўрокі нічому не навучылі раённае кіраўніцтва. Зяблёва зноў зрываецца. На 20 кастрычніка план выканан толькі па 57 проц.

12 буйнейшых калгасаў раёна, у тым ліку калгасы «Свет», Баровішкага сельсовета, «Новы свет», Беразнёўскага сельсовета, «Орка», Восаўскага сельсовета, і інш. яшчэ не пачыналі зяблёва. Калгасы Мышкаўскага сельсовета ўзаралі ўсяго 21 проц. глебы, Лешчанскага сельсовета 20 проц., Старцаўскага сельсовета—8 проц. і г. д.

У Бабруйшчыне назіраецца простае ігнараванне зяблёва, як аднаго з асноўных мерапрыемстваў па ўзнімцці ўраджайнасці. Напрыклад, калгас «Чырвоная цяса» з 150 га дагэтуль не ўзараў ні гектара. Старшыня калгаса Жыжнеўскі стараецца давесці, што «зараз калгас не можа зяблёў, бо ўсе заняты на капанні бульбы». Аднак, пры праверцы выяўляецца, што ў гэтым калгасе штодзённа гуляе без работы 8 калгаснікаў і 10 коняй. З гэтай рабочай і цягавай сілы можна было арганізаваць звяно па ворыву зяблёва. Звяно пры сярэдняй нагрузцы магло штодзённа падымаць па кляць гектараў. Калі-б ворыва пачалося ў пачатку верасня, план быў бы даўно выканан.

Калгас «Чырвоная Беларусь» сёлета атрымаў надзвычай нізкі ўраджай з прычыны ігнаравання агра-тэхнікі, Не гледзячы на гэта, зяблёва ў калгасе зараз зрываецца.

Калгас «Чырвоная Буда», скончыўшы ўборку бульбы, усю рабочую сілу перакінуў па мапацьбу, не вылучыўшы ніводнага звяна на зяблёва. У рэзультаце 85 гектараў, якія павінны быць узняты на зіму, яшчэ не ўзараны.

Зусім іншы малюнак мы назіраем там, дзе праўленне сапраўды змагаецца за павышэнне ўраджайнасці. У калгасе «Чырвоны барацьбіт», Міхалеўскага сельсовета, разам з сяўбой азімых пачалі зяблёва, на якое вылучылі пастаянае звяно. План зяблёва выканан, ужо ўзаралі 95 га.

Прыклад перадавых разбівае ўшчэнт усякія аб'ектыўныя прычыны, на што спасылаюцца не толькі ў калгасах, але і ў раённых арганізацыях.

П. АРЦЕЛЬНЫ.

УСЕБЕЛАРУСКІ РЭЙД ЦКК і „ЗВЯЗДЫ"

У ДУБРОВЕНСКІМ, МСЦІСЛАЎСКІМ, ЧЫРВОНАПОЛЬСКІМ І КЛІМАВІЦКІМ РАЁНАХ ПАЛОВА БУЛЬБЫ ЯШЧЭ НЕ ЎБРАНА

КІРАЎНІЦТВА ГЭТЫХ РАЁНАЎ ПРАЯВІЛА ЯЎНУЮ ПАЛІТЫЧНУЮ СЛЕПАТУ, НЕ ВЫКРЫЛА КУЛАЦКІХ МАНЕЎРАЎ, НАКІРАВАНЫХ НА ЗРЫЎ УБОРКІ

Выкапаць поўнасцю ўсю бульбу, пераараць поле, каб не дапусціць малейшых страт ураджаю—абавязак кожнага комуніста, комсамольца, кожнага сумленнага калгасніка

Ход уборкі бульбы па БССР

(У гектарах на 20 кастрычніка.)

План	Убрана	Проц. выканання	Рост за пяцідзённку
611.755	504.433	82,5	13,0

ВЫКРЫЦЬ ДА КАНЦА КУЛАЦКУЮ ТАКТЫКУ

ЧЭРЫКАЎ.

Да 20-га кастрычніка ў раёне яшчэ не было выкапана каля 1.300 га бульбы. Рэйд РСІ і другу выявіў прычыны злачынлівага зацягвання ўборкі.

У Рэчыцкім сельсавеце ў калгасе «Другая пяцігодка» было пасеяна 60 га бульбы, а ўбрана каля 30. Гэты калгас зацягнуў таксама здачу бульбы дзяржаве. Старшыня калгаса член партыі Беларэчанко на справе праводзіў кулацкую лінію. Ён загадаў раней убіраць бульбу на прысядзібных участках. Зразумела, што такое распараджэнне было на руку кулацкім элементам, распальвала дробна-буржуазныя тэндэнцыі і зрывала ўборку бульбы.

Два месяцы назад гэтаму калгасу была выдзелена бульбакапалка. Яна атрымана са склада Белсельснаба толькі 10 кастрычніка і дагэтуль не прыстасавана яшчэ да работы.

У калгасе «Гігант», таго-ж Рэчыцкага сельсовета, з 160 га ўбрана каля 120. Старшыня калгаса член партыі Белісаў заявіў удзельнікам рэйда: «Не ваша справа, калі мы скончым капанне. Дней праз дзесяць убярем усё. Спадзяюся, што бульба на полі не зазімуе». Аднак, гэта толькі пустое бахвальства. Замест кіраўніцтва ўборкай і мабілізацыі калгаснікаў на палявыя работы, Белісаў закінуў работу і аддаўся п'янству.

А працікаўцеся якасцю ўборкі. Вы убачыце на полі шмат непадабранай бульбы—пакінуты цэлыя гняздзі. Брыгадзір першай брыгады Чарткоў на заўвазе праверачнай брыгады адказаў: «У маёй брыгадзе бульба добра ўбіраецца». Яўнае ашуканства! Першая брыгада працуе горш за іншых.

Возьмем калгасы Верамееўскага сельсовета. У калгасе «Дванаццацігоддзе» уборка бульбы таксама зацягнулася. Прадцыцыплёна ў запаздае. Ёсць шмат выпадкаў прагулаў і спазнення на работу. Многія калгаснікі выходзяць на працу ў 10-11 гадзін раніцы.

У калгасе «Чырвоная Звязда» павінны былі выйсці на работу 72 чал., а выйшлі 57. Як высветлена, праўленне калгаса дазволіла частцы калгаснікаў не ісці на поле, а капаць бульбу на сваім участку.

У калгасе імя Будзённага, Горкаўскага сельсовета, старшыня Сельмахаў, не разлічыўшыся з дзяржавай, не склаўшы насенных і страхавых фондаў, без усякага ўліка раздаваў бульбу калгаснікам.

У калгасе імя Чарвякова, таго-ж сельсовета, брыгады рэйда выявілі злачынныя адносіны да якасці. У барознах пакінуты ямы, у якіх знойдзена шмат бульбы.

У калгасе «Піянер» участак, засеяны азімым жытам, на прасторы каля 2 га ўвесь усеян бульбай, і ніхто з праўлення не паклапаціўся падабраць яе.

Праверачныя брыгады выявілі дрэннае становішча з хаваннем бульбы на прыёмачным пункце ст. Асавец. Павеці дрэнна набудаваны. Пры дажджлівым надвор'і бульба мокне. У ноч на 10 кастрычніка павець абрушылася і пашкодзіла шмат прадукцыі. На гэтымжа пункце бульба валяецца на зямлі і яе топчуць нагамі. Зусім непаладжана ахова бульбы—не раскрадаюць як здатчыкі, так і рабочыя пункта.

На базе Чэрыкаўскай райзагатканторы брыгада выкрыла факт пражы звыш 4-х цэнтнераў бульбы загаўпчыкамі Навумавым і Ільіным. Справа перадана пракуратуры.

Усе прыведзеныя факты сведчаць аб адным.

Чэрыкаўскія кіруючыя арганізацыі не забяспечылі аперацыйнага кіраўніцтва ходам уборкі, правялі яўна ліберальныя адносіны да спроб варожых элементаў сарваць капанне бульбы. Уборка ідзе ў раёне самацёкам.

Н-Н.

БОЛЬШ ПАКІДАЮЦЬ, ЧЫМ ВЫКАПВАЮЦЬ

УШАЧЫ.

Ушацкі раён у рэспубліканскай зводцы ўборкі бульбы займае першае месца. Ён да 20-га кастрычніка ўбраў усю плошчу бульбы ў памеры 6.651 га.

Аднак першыя-ж дні рэйда брыгад РКК-РСІ і другу выявілі рад фактаў поўнага ігнаравання якасці ўборкі. Ва многіх калгасах і сельсоветах не здолелі спалучыць барацьбы за датэрміновае выкананне плана з высокай якасцю капання.

У калгасе «Маяк соцыялізма», Гарадзецкага сельсовета, у брыгадзе № 1 (брыгадзір ПУГАЧ) у зямлі пакідаюць больш бульбы, чым выкапваюць. Бульбяніцы не пераворваюцца. Праўленне калгаса зусім прымірэнча адносіцца да тых, хто падрывае якасць уборкі.

У калгасе «Прымежны калгаснік» працадзённіцтва зусім не наладжана. У брыгадзе № 2 — 17 жанчын, а на работу выходзяць толькі 8. У брыгадзе № 1 лічыцца 30 калгаснік, з якіх на работу выходзяць толькі 10. Пядаў на ва ўсім калгасе на работу выйшла толькі 13 чалавек. Іншыя працавалі на сваіх прысядзібных участках, якія часта дасягаюць 1—1,5 га. Калгаснікі Марковіч, Жых, Вінік, Рыжык працуюць выключна на сваіх гародах і сістэматычна не выходзяць на калгаснае поле.

Парторг калгаса Карабань праявіў яўную палітычную слепату, фактычна патураў манерам кулацтва, наміраваным на падрыў калгаснай вытворчасці.

У калгасе «Бязбожнік» вельмі дрэнна захоўваюць бульбу. Больш 10 тон бульбы ляжаць на полі непрыкрытымі, ніхто не ахоўвае яе. Гэтым даюць поўную волю злодзеям і расхрадвальнікам калгаснай маемасці. Старшыня калгаса Фейгін, не гледзячы на сігналы кантрольнага паста і калгаснай насенгазэты, не прыняў супроць гэтага ніякіх мер.

Рэйдавыя брыгады выявілі па прыёмачным пункце факты расхрадвання бульбы прыёмшчыкам Андрэйчыкам. Так, напрыклад, калгасу «Прамень», Жарскага сельсовета, не палічылі 28 кгр. бульбы.

Абавязак раённых арганізацый забяспечыць пераворванне бульбяніч з тым, каб не пакінуць у полі ні аднаго кілаграма, каб поўнасцю ліквідаваць страты.

Усякія спробы варожых элементаў распальваць дробна-буржуазныя тэндэнцыі, за кошт калгасных зямель разгуваць прысядзібныя участкі павінны сустрэць розны адпор.

Т. Б.

Зрыўшчыкі ўборкі

НАСТУПНЫЯ РАЁНЫ ІДУЦЬ НА АПОШНІМ МЕСЦЫ ПА БССР ПА ТЭМПАХ УБОРКІ БУЛЬБЫ:

ДУБРОВЕНСКІ РАЁН ДА 20 КАСТРЫЧНІКА ЎБРАЎ 51,2 ПРОЦ. ПЛОШЧЫ, МСЦІСЛАЎСКІ — 51,2 ПРОЦ., КЛІМАВІЦКІ — 59,2 ПРОЦ., ЧЫРВОНАПОЛЬСКІ — 49,5 ПРОЦ.

ЗАВАЯВАЦЬ ПРАВА НА МЕСЦА У КАСТРЫЧНІЦКАЙ КАЛГАСНАЙ КАЛОНЕ

400 дэлегатаў перадавых калгасаў, калгаснікаў-ударнікаў, рабочых саўгасаў, МТС, лепшых актывістаў—настаўнікаў, аграномаў, лепшых комсамольцаў і работнікаў сельсоветаў заязджаюць у Менск—у чырвоную сталіцу БССР для ўдзела ў святкаванні XVI гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Лепшыя ўдарнікі калгасных палёў прыедуць удзел у калгаснай калоне Кастрычніцкай дэманстрацыі працоўных чырвонай сталіцы.

Першае месца ў калоне заваявалі Барысаўскі, Дрысенскі, Сенненскі, Слуцкі і Аршанскі раёны,—перадавікі па ўсіх сельска-гаспадарчых работах. У перших радах ідуць таксама Асіпавіцкі, Веткаўскі, Чырвона-слабодскі, Старобінскі, Кармянскі, Менскі, Шумілінскі, Гомельскі, Віцебскі і Магілёўскі раёны БССР, якія па всіх паказальніках выканалі планы вялікай сярэдня-рэспубліканскіх.

Усяго толькі тры мандаты на свята атрымаў Магілёўскі раён, па 4 мандата на свята атрымалі Ельскі, Брагінскі, Церахоўскі, Уваравіцкі і Буда-Кашалёўскі раёны. Гэтыя раёны не завяршылі збожжа і бульбапаставак і не закончылі зяблёва і ўборкі бульбы. Гэтыя раёны патрэбаваны аб тым, што калі ў бліжэйшыя дні не дабіцца рашаючага пералома, яны будуць пазбаўлены і гэтых мандатаў.

Зусім пазбаўлены мандатаў на ўдзел у калгаснай калоне Дзяржынскі, Бешанковіцкі, Круглянскі, Горацкі, Клімавіцкі, Лепельскі, Лагойскі, Мсціслаўскі, Дуброўенскі, Лёзненскі, Сіроцінскі, Шклоўскі, Петрыкоўскі, Плешчаніцкі, Чырвонапольскі, Заслаўскі, Гарадоцкі, Асвейскі, Суражскі, Ушацкі, Талачынскі і Чашніцкі раёны. Гэтыя 23 раёны ганебнымі тэмпамі выконвалі планы азімай сяўбы, ганебна адстаюць у выкананні аб'ектыўнай перад дзяржавай.

Цэнтральная конкурсная камісія па атрымаўшы мандаты ў калгасную камісіі гэтыя раёны, што яны лепшу толькі ў тым выпадку, калі ў бліжэйшую пяцідзённку дабіюцца рашаючага пералома.

Цэнтральная конкурсная камісія па спаборніцтву з Заходняй вобласцю разаслала ў раёны вызначаную ім колькасць мандатаў.

Зараз барацьба пераносіцца ў калгасы, сельсоветы, МТС, саўгасы, у школы. Права на ўдзел у калгаснай калоне атрымае той, хто да Кастрычніцкай гадавіны поўнасцю выкрые сваю заказчанасць перад дзяржавай, хто забяспечыць багаты ўраджай 1934 года выкананнем плана зяблёва, хто ўсебаковай кадрыхтоўкай жывёлы да зімы забяспечыць захаванне і рост калгаснага і саўгаснага паголоўя.

Трэба дабіцца такой пастаноўкі ўлікі ў калгасах, каб кожны калгаснік атрымаў столькі, колькі ён зарабіў, каб калгасныя працадні не дасталіся гультаям.

Права на ўдзел у калгаснай калоне атрымае той, хто, завяршыўшы ўсе работы і выканаўшы абавязкі перад дзяржавай, дабіўся правільнай пастаноўкі ўліка працадзён і размеркавання калгаснага дахода.

Дакада, якая засталася да Кастрычніцкіх свят, павінна быць дакадай барацьбы за:

неадкладнае выкананне ўсіх абавязкаў перад дзяржавай, скончэнне ўсіх работ на палях, разгортванне перашапачатковай апрацоўкі і здачы ільна прадукцыі, насенай пазыкі і натуроплаты МТС;

неадкладнае выкананне зяблёва;

ушчыльненне і скончэнне будаўніцтва абор, свінарнікаў, стайняў, выдзяленне кармавых фондаў для ўсяго стада калгасаў і саўгасаў.

Усе раённыя газеты павінны паладзіць сістэматычнае асвятленне і барацьбу за атрымане мандатаў пасобнымі калгасамі, калгаснікамі, рабочымі МТС і саўгасаў.

Лепшаму ўдарніку тав. _____
(Прозвішча, імя і па бацьку)

_____
(калгас, саўгас, МТС, сельсавет, раён)

За прыкладную барацьбу, за паспяховае і высокаякаснае завяршэнне ўсіх сельска-гаспадарчых работ і выкананне селгаспаставак дзяржаве. Цэнтральная Камісія па соцспаборніцтву БССР з Заходняй вобласцю запрашае Вас для ўдзелу ў святкаванні XVI-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Менску

Пролетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

„Лепшы спосаб адсвяткаваць гадавіну вялікай рэвалюцыі—гэта згрупаваць увагу на нявырашаных задачах яе"
(Ленін).

МАНДАТ
НА ПРАВА ЎДЗЕЛУ Ў КАЛГАСНАЙ КАЛОНЕ
КАСТРЫЧНІЦКАЙ ДЭМАНСТРАЦЫІ
Ў МЕНСКУ—СТАЛІЦЫ БССР

Узяць у будучым годзе яшчэ больш высокі ўраджай, заваяваць яшчэ больш высокі прыбытак

„Зробім калгасы большэвіцкімі, а калгаснікаў заможнымі".
(Сталін)

1933 г.

УСЕБЕЛАРУСКАЯ ПЕРАДКАСТРЫЧНІЦКАЯ ВЫТВОРЧАЯ ПЕРАКЛІЧКА

Сустрэць XVI гадавіну Кастрычніка поўнай ліквідацыяй брака— пачэсная задача швэйнікаў фабрыкі „Кастрычнік"

З бракаробаў ва ўдарнікі

Менская фабрыка «Кастрычнік» з'яўляецца адным з перадавых прадпрыемстваў швейнай прамысловасці Совецкай Беларусі.

За дзевяць месяцаў прамфінплан па валавой продукцыі выкананы на 102 проц.

Падрыхтоўка да 16-й гадавіны ўзвараушыла рабочых калектыў фабрыкі, узмацніла тэмпы выканання прамфінплана. Асобныя брыгады і агрэгаты сістэматычна па выкананьню сваё прамфінплан. Узяць брыгаду т. Лядышава 2 агрэгата (6 фасон). Брыгада складаецца з 45 рабочых, з якіх 36 ударнікаў. Брыгада амаль штодзённа перавыконвае сваё вытворчае задание. Напрыклад, 24 кастрычніка брыгада прамфінплан выканала на 102,3 проц. Замест раней ужытых 40-50 пераробак, зараз у брыгадзе бывае ўсяго 10—13 пераробак.

Таксама і брыгада восьмага фасона, якая раней выконвала план на 90,3 проц., зараз пры разгортванні соцыялістычнага спаборніцтва ўзняла выкананьне прамфінплана да 101 проц. Брыгада працуе амаль без пераробак.

Асаблівае значэнне ў паспяховым выкананні прамфінплана мае так званае змена-сустрэчнае планаванне. Гэта дапамагае ўзмацненню ступень свядомага вытворчага планавання непасрэдна ўцягванне рабочых у актыўны ўдзел па арганізацыі вытворчасці. Кожны дзень абмяркоўваецца брыгада на 5-10 мінут. Абгаворваюцца вынікі работы за мінулы дзень і вызначаюцца шляхі для ліквідацыі мінулых месяцаў недахопаў у рабоце.

Майстра на аснове даных аб позавытворчай вытворчасці на лепшае і адпаведна прамфінплану дакладвае на змена-сустрэчнай нарадзе аб вытворчым заданні на рабочы дзень. Гэта дадзенае пры ўдзеле рабочых абгаворваецца і прымаецца як праграма, абавязковая для выканання.

Такая масававытворчая форма ўжо дала свае станоўчыя вынікі.

Калі першыя месяцы задание па брыгадзе дзякаяся на плану ў 95 адсотак у месяц, то ў жаўтні на змена-сустрэчным планаваньні задание ў 101 адсотак, а ў верасні і кастрычніку на 113 адсотак. У большасці выпадкаў задание, узятае брыгадай на змена-сустрэчнай нарадзе, выконваецца.

Вялікую роль змена-сустрэчнае планаванне адыграе і ў барацьбе за якасць продукцыі. На кароткай штодзённай нарадзе выносіцца на абгаворванне канкрэтныя бракаробы, прымаецца цэлы рад мер да рабочых, якія дапускаюць непаробкі ў сваёй рабоце. Пераважна выкліку, калі рабочыя, якія раней рабілі брак, пад уплывам разгортвання масавай работы, выпрацоўваюць свае шляхі.

Вось, напрыклад, работніца 2-га агрэгата Куніс раней выконвала шмат брака. Пасля індывідуальных з ёю гутарак, аб бракаробах на змена-сустрэчнай нарадзе, рабочая Куніс справілася і больш ужо не робіць брака. Зараз тав. Куніс з'яўляецца ўдарніцай.

Аналагічнае становішча і з рабочым тав. Самсонаў. Ён з'яўляўся кантралёрам, які прапускаў вельмі часта брак па іншым. За гэта над ім быў арганізаваны грамадска-выхаваўчы суд як над бракаробам, ён вывешан быў на чорную дошку. Гэта ўскалыхнула старога рабочага тав. Самсонаў. Часта прыходзілася з ім гутаркі аб шкодлівасці брака, аб шляхах знішчэння непаўнаў. У выніку усяго гэтага рабочы Самсонаў з бракаробаў ператварыўся ў сапраўднага ўдарніка якасці на фабрыцы.

Такія прыклады на швейнай фабрыцы «Кастрычнік», калі былыя бракаробы, дзякуючы разгортванню масава-вытворчай работы, усведамляюць шкодлівасць брака і мерапрыемствы ў сапраўдных помачнікаў у барацьбе за якасць продукцыі не адзінкавыя. Безумоўна, фарма работы з бракаробамі, як індывідуальная гутарка, асвятленне ў штодзённых і шматтыражных, светафор пры умелай арганізацыі адыграюць вялікую ролю ў барацьбе за якасць продукцыі.

Але фабзавкомы арганізацыі «Кастрычніка» дасканалова правядзіць гэтую масава-выхаваўчую работу ў барацьбе за якасць. Мала толькі гутарыць з рабочымі, якія робяць брак, мала вывесіць іх на чорную дошку, светафор і інш. Трэба яшчэ прыняць канкрэтныя меры, каб лажучыць рабочага рабіць прадукцыю лепшай якасці, узбросіць яго каштоўнымі ведамі аб сваёй апаратуры, аб вытвор'ве. А гэта ажраз і з'яўляецца слабым месцам у рабоце фабрычных арганізацый, асабліва фабкома.

Партыкалетыў, фабком і дырэкцыя фабрыкі «Кастрычнік» і на сённяшні дзень яшчэ не падхапілі каштоўную ініцыятыву перадавікоў соцыялістычнай індустрыі аб перадачы старых рабочых і спецыялістаў над малалікаком па перадачы вытворчага вопыта. Загалчык вытворчага сектара фабкома тав. Марошак адкрыта прыхаваецца, што гэта пытанне яны прамаргалі. На фабрыцы ёсць шмат старых рабочых, якія добра ведаюць справу швейнай вытворчасці, але яны свае багатыя веды трымаюць пры сабе ў той час, як мала дыя работніцы, якія ўпарнымі працуюць на швейнай фабрыцы, адчуваюць патрэбу ў такой вытворчай дапамозе.

Фабком спасылаецца на тэхнічную вучобу, якая быццам належна разгорнута на фабрыцы. Гэта не верна. Тэхнічная вучоба знаходзіцца яшчэ далёка не на належнай вышыні.

Вось ужо два месяцы, як у нас займаюцца тэхнічныя гурткі па павышэнні кваліфікацыі рабочых,—кажа балаўра работнік фабкома тав. Марошак. Але ці можна прыняць работу гурткоў адзавальняючай, калі на фабрыцы ў гэтыя гурткі запісана з 1600 чалавек усяго толькі 80 рабочых.

Адна толькі агітацыя сярод рабочых супроць брака яшчэ не вырашае пытання аб поўным знішчэнні брака на соцыялістычным прадпрыемстве. Патрэбны канкрэтныя веды тэхналогіі вытворчасці, варштата.

Слабое і нізавое тэхнічнае вузлы таксама яшчэ не заняло належнага месца ў рабоце арганізацый фабрыкі. Майстра, інструктар не забяспечваюць сваёй авангардзкай ролі ў барацьбе за якасць прадукцыі. Наадварот, у асобных выпадках яны проста падтрымліваюць браку. Вось факт. У пачатку работы работніца Эціна заўважыла, што ў пачках спытых рукавоў быў запышты пэўны амаль на паўтары сантыметра шырэй, чым належыць. Эціна ўказала на гэта інструктару Бескінай. Але не клеймячы на гэты яўны брак, інструктар Бескіна пускае рукавы ў пашыўку. Толькі тады, калі майстра Зянькевіч пацвердзіў, што рукавы сапраўды нятоўныя, яны не былі пушчаны ў істуж ку. А вось другі факт. 10-га кастрычніка ў другой змене да работніцы Гардон паднеслі на істужку рабіць пачку падбартоў 42 размера, у той час, як у вытворчым працэсе фабрыкат выпрацоўваўся 46 размера. Работніца Гардон зусім законна адмовілася рабіць і паказала гэты паўфабрыкат майстру Рэманову. Але Рэманаў замест падачы работніцы Гардон паўфабрыката адпаведнага размера, даў яшчэ больш—48 і загадаў шыць. Зусім зразумела, што гэта не толькі нагарнае якасць прадукцыі, але і вельмі моцна б'е па гаспадарчаму разрахунку і па сабекошту прадукцыі.

П. В.

РЭАЛЬНАСЦЬ ПЛАНАУ У НАС САМІХ

На віцебскай швейнай фабрыцы «Сцяг індустрыялізацыі» разгарнулася масавая вытворчая работа па ўзняцці тэмпаў выканання прамфінплана. Рыхтуючы падарунак да XVI гадавіны Кастрычніка, комсамол фабрыкі ў ліку 500 чалавек абвясціў спаборніцтва па падвышэнні моладзевых участкаў на выкананні вытворчай праграмы.

Першая дэкада кастрычніка ўжо дала свае станоўчыя вынікі. Комсамольскія абавязацельствы ператвараюцца ў жыццё.

Моладзевы ўчастак імя КІМ выканаў за 12 дзён кастрычніка месячны прамфінплан на 107,3 проц., участак імя X з'езда ЛКСМБ выканаў вытворчы план за гэты-ж час на 102,8 проц., участак імя сусветнай спартакіяды — на 109 проц. месячнага задання.

Лепшыя ўдарнікі ўчастка комсамольцы т. т. Козлік, Фельдман і Багарад, працуючы на адказных аперацыях цэха па пашыўцы штаноў, не маюць ні аднаго прогула брака. Штодзённа выконвае прамфінплан на 112—119 проц. і моладзевы ўчастак закройнага цэха. Значна палепшылася якасць працуючых. Брак сустракаецца вельмі рэдка.

Комсамольцы фабрыкі ўзялі на сябе абавязацельства да Кастрычніцкіх свят ахапіць па ўсе 100 проц. комсамольцаў і працоўную моладзь індывідуальным соцспаборніцтвам, палітвучобай і падрыхтаваць групу моладзі да здачы экзамена на тэхнічнаму мінімуму. Правядзена пераклічка моладзевых участкаў па абмену вопытам па рэалізацыі ўзятых на сябе абавязацельстваў.

(БЕЛТА).

10 міл. эканоміі кожны год

Пытанне ацэнкі даўно ўжо пры коўвала тэхнічную думку да рацыяналізацыі гэтага важнейшага ўчастка будаўніцтва.

Галоўны інжынер Белдзіпрэкраеста тав. Адзльскі ва ўмовах БССР ажыц цявіў ідэю, якая рысавалася досыць шырокаму, аўтарытэтнаму вучонаму ў пытаннях ацэнкі праф. Чапліну.

Ужо ў 1929 г. інжынер Адзльскі прыстасаваў сістэму вадзянога ацэнкі без крантаў падвойнай рэгуляроўкі ў туберкулёзным корпусе г. Барысава, у жылым доме фабрыкі штучнага шоўка ў Магілеве, у будынку Дзяржбанка ў Менску (1930 г.) і інш. Будаўніцтва такіх сістэм вадзянога ацэнкі без крантаў падвойнай рэгуляроўкі праводзілася інж. Адэльскім і ў 1930-31 г. Жылы дом Гомельмаша, будынак ВОНГ у Менску пабудаваны па вадзяной сістэме ацэнкі.

У гэтым годзе падобная бескрантавая сістэма ацэнкі была ўжыта на частцы корпуса дома Ўрада ў Менску. Пабудованая сістэма вадзянога ацэнкі без крантаў падвойнай рэгуляроўкі ў 8-павярховай частцы дома Ўрада (аб'ёмам 40.000 куб. метраў) зусім ясна паказвае, што сістэма працуе здавальняюча. Прагрэў на ўсіх станках і паверхах роўнамерны і нічым не адрозніваецца ад прагравання апальваючых прыбораў рашты будынка, дзе ў 1932 г. былі ўстаноўлены па апальваючых прыборах кранты падвойнай рэгуляроўкі.

Упэўнены ў правільнасці сваёй ідэі, інж. Адзльскі першым у нашым Саюзе сапраўды ажыццявіў будаўніцтва сістэмы вадзянога ацэнкі без крантаў падвойнай рэгуляроўкі, па вы расходуецца дэфіцытны метал—медзь і бронза.

Эканомія, якая атрымліваецца ад правядзення ідэі тав. Адзльскага, вельмі вялікая. Паводле скромных падлікаў, у нашым Саюзе кожны год будуецца каля 2-х мільёнаў пакояў. Лічачы па кожны пакой па адным апальваючым прыборы без крана падвойнай рэгуляроўкі, мы на сутнасці эканомім два мільёны крантаў. Нават пры сярэдняй цане аднаго кранта ў 5 руб., усё гэта дае эканомію ў 10 мільёнаў руб. кожны год.

Ідэя інж. Адэльскага безумоўна спойдзе вялікае прыстасаванне ў нашым будаўніцтве і з'эканоміць для нашай народнай гаспадаркі шмат дэфіцытнага метала.

Інж. Кулькін.

Па-ранейшаму чарговасць кампаній

Полацкі леспрамгас устуціў у чацвёрты квартал з вялікімі прарывамі. Калі план па загатоўках будаўнічага матэрыяла і дроў неравыканан, то на вывазцы запалне выканана толькі на 70 проц. Тым часам, у чацвертым квартале тэмпы павінны былі-б парастаць. Але гэтага няма. За дзве дэкады кастрычніка план выканан па будаўнічых матэрыялах па 19 проц., па дровах на 8 проц. Напрыклад, на Фарынаўскім участку (прараб Дамброўскі) па будаўнічых матэрыялах прамфінплан выканан усяго на 1 процант, на Гаранскім участку (прараб Івансў) — на 16 проц., па дровах — на 25 проц.

Цэлы рад сельсоветаў і калгасаў — Гомельскі, Вароніцкі, Алесаўскі — яшчэ зусім не прыступілі да вывазкі. Нават не заключаны дагавары з прарабскімі ўчасткамі.

У многіх сельсоветах вельмі дрэнна ідзе развёрстка плана па калгасах і адпаасобных гаспадарках. Чакаюць чаргі, пакуль не скончаць с.-г. кампаніі. Вось, напрыклад, Замшанскі сельсовет (старшыня Метлюх). План 3-га квартала выканаў толькі на 10 проц. План 4-га квартала поўнасцю яшчэ не развёрстан. Старшыня апартуністычна разважае: «Пакуль не скончым план збожжапаставак, мы не зможам разгарнуць лесазагатоўкі». Пад носам у гэтага старшыні сельсавета такія калгасы, як «Кастрычнік», «Зямляроб», «Шлях Леніна», нават зусім не прыступілі да вывазкі леса. Такое-ж становішча і ў калгасе «Чырвоная паляна», Алесаўскага сельсавета. (Старшыня калгаса Івансў). Калгас пазнейш быў яшчэ ў III квартале, згодна заключанага дагавора з Дрэтунскім участкам, вывезці 727 куб. метраў дроў, а вывез толькі 5. Аб плане 4-га квартала там яшчэ і не думаюць. Калгас «Парыжская комуна» (Шашілаўскага сельсавета) замест 180 куб. метраў вывез у III квартале толькі 20.

Але ёсць асобныя сельсоветы і калгасы, якія па-ўдарнаму змагаюцца за выкананне плана вывазкі дроў і будаўнічых матэрыялаў. Яны разгарнулі сапраўды масавую работу, не наглядаючы чарговасці кампаній. Так, Громаўскі сельсовет (старшыня Каралёў) ужо даўно развярстаў план IV квартала па калгасах і прыступіў да заключэння дагавора з прарабскім участкам. План III квартала гэты сельсовет перавыканаў: замест 700 куб. метраў вывезена 730. Калгасы «Чырвоны баец», «Інтэрнацыянал» выканалі палову плана ўжо IV квартала. Калгас «Адказ інтэрвентам», Дамінікоўскага сельсавета (старшыня Старавойтаў), на 10 кастрычніка план IV квартала выканаў на 50 проц. і ўзяў на буксір суседні адстаючы калгас.

Гэтыя адзінкавыя факты сведчаць аб тым, што там, дзе за справу вывазкі дроў узяліся па-большэвіцку, не чакаючы скончэння с.-г. кампаній, там ёсць і добрыя рэзультаты.

Загатовіць 15.000 куб. метраў будаўнічых матэрыялаў і 14.000 куб. метраў дроў, вывезці 35.000 куб метраў будаўнічых матэрыялаў і 30.000 куб. метраў дроў — такі план Полацкага леспрамгаса. Безумоўна, план зусім рэальны. Патрэбна толькі шчырае жаданне ўзяцца за работу, каб сапраўды забяспечыць пролетарскія цэнтры і прамысловасць БССР будаўнічымі матэрыяламі і дровамі.

ФРЫД.

УЗМАЦНЯЮЧЫ ПРАЦОУНУЮ ДЫСЦЫПЛІНУ, ВЫВЕДЗЕМ ВАГОННУЮ ГАСПАДАРКУ НА ПЕРАДАВУЮ ЛІНІЮ

НА ЗАВОДЗЕ ІМЯ МЯСНІКОВА ШТОДЗЕННА ТРАЦІЦЦА НЕПРАДУКЦЫЙНА 67.360 МІНУТ

Штодзённа кожны рабочы завода імя Мяснікова непрадукцыйна траціць 82 мінуты. Весь завод — 67.360 мінут. За месяц завод траціць 4.110 чалавекадзён.

Даныя складзены на аснове фатаграфіі рабочага дня. Брыгады рабочых падлічылі, што пры цяперашняй колькасці рабочых толькі за лік весь гэтых мінут завод можа выканаць плана па пасажырскаму цаху выпусціць з капітальнага рамонта адзін класны вагон прамых зносін, па кузнечнаму — зрабіць 2 тоны балтоў і заклёпак і 15 шкуматычных рэсор, па механічнаму цаху абтачыць 25 калёсных пар, абстругаць 40 буксаў, зрабіць 20 буферыяў і 20 буферных стаканаў. Тое-ж і на другіх цэхах.

Між тым, завод далёка не выконвае сваёй праграмы. Правядзеная заводская канферэнцыя па пытанні аб выкарыстанні сямігадзінцага рабочага дня пацвердзіла, што злачынае разбазарванне рабочага часу з'яўляецца галоўнай прычынай адставання завода.

Завод у выстарчальнай меры забяспечан інжынерна-тэхнічным персаналам. І ўсё-ж арганізацыя працы з'яўляецца самым слабым месцам, у выніку чаго рабочы дзень прадукцыйна нагружан толькі на 80 проц. Галоўны інжынер завода, комуніст Гальцаў заявіў на канферэнцыі, што пытанне арганізацыі працы на заводзе зусім новае, ім ніхто яшчэ не займаўся: «на сорам мне, я не ведаў да сённяшняга дня аб лікуды не вартай расстаноўцы рабочай сілы».

Адно толькі прастойванне за атрыманнем інструментаў складае штодзённа каля 400 гадзін, што роўна часу, патрэбнаму па абточку 100 калёсных пар. Стаяць людзі за малаткам, за слесарным зубілам, за ключамі і інш. Няўжо нельга забяспечыць гэтымі інструментамі кожнага слесара і гэтым спыніць затрымкі ў рабоце?

Дрэнна і з якасцю інструмента, які выраблецца самым заводам. У той час, як завод мае ў сваіх склапах храмаванкелівую сталь, кавальскія зубілы робяцца з рэсорнай сталі, зусім непрыгоднай для халоднай рубкі. У выніку штодзённа ламаецца больш 50 штук зубіл, што дае кожны месяц спрат у 2.700 рублёў. Лёгка ўявіць сабе продукцыйнасць працы, калі на працягу аднаго дня ў рабочага банджыка ламаецца 8 зубіл.

Асабліва дрэнна пастаўлена ўнутрыцэхавае і міжцэхавае планаванне, што выклікае вялікія прастоі, псаванне ўжо зробленага і яркі графіка выпуска вагонаў. Часта бывае, што ў адзін вагон збіраюцца ўсе кваліфікацыі і атрымліваецца, што маляры чакаюць, пакуль скончаць работу сталяры, а слесары ці электрычкі змазваюць тое, што зробіць маляры.

Няма сваячасовых клопатаў аб запасных частках. Брыгадзір сталярнай брыгады Міцямкін на графіку навішан быў пастаянць законныя рамы ў вагоне 4.304 по пазней 16 кастрычніка. Гэта работа не больш як на адзін дзень, але Міцямкін толькі 15-га ўспамінае, што рамы раней трэба здаць у малярную на паліроўку, якая зойме 2-3 дні. У выніку — графік прыраваецца. Ні майстар Хваль (член партыі), ні начальнік цэха Гаховіч, не цікавяцца гэтым пытаннем.

Завод мае значныя прастоі з-за слабай працоўнай дысцыпліны. У рамонтным цэху прастоі складаюць 10,7 проц. рабочага часу, у пасажырскім, самым вялікім на заводзе, 12,6 проц.

Злачынае разгільдзяйства паказвае слесар Крупнік, які за сямігадзінны рабочы дзень выраўнівае ўсяго 3 жалезных пруткі коштам усяго на 45 кап. Зусім зразумела, што Крупнік нічога агульнага не мае з званнем рабочага і выражае сабой інжынерні класавага ворага падарваць работу чыгуначнага транспарта.

Трэба адзначыць, што некаторыя майстры і брыгадзіры самі дапускаюць парушэнні дысцыпліны, статута (майстар Хваль і інш.).

На заводзе імя Мяснікова ёсць нямала рабочых і цэлых брыгад, займ з дня ў дзень аддаюць узорнае выкананьне ўсе 7 гадзін і сістэматычна выконваюць прамфінплан. Гэта — брыгады кровельшчыкаў Пабеда, брыгада маляроў Гусева, гэта — лепшыя ўдарнікі завода, каваль Клімовіч, прэсаўшчык Гарачун, столяр Галушка, слесар Яраслвіч і г. д. і г. д. Іх вопыт яшчэ не распаўсюджан.

Задача заводскіх арганізацый, атрымаўшых у палітадзеле моцнае партыйнае кіраўніцтва, рашуча бяць на спробах парушыць дысцыпліну, ператварыць унутрызаводскае планаванне, дабіцца поўнай загрузкі рабочага дня.

К. Верамейчык.

ПАРАДНЫЯ ПРАМОВЫ ЗАМЕСТ РАБОТЫ

Ціха і плаўна цяклі прамовы. Гаварылі аб падрыхтоўцы Менскага вагоннага дэпо да зімы. Ружовымі фарбамі начальнікі ўчасткаў Юхманаў і Сноцкі маляваді перад адкрытым пар тыйным сходам стан падрыхтоўкі.

Усё ў парадку, уся бяда ў тым, што служба пуці падводзіць—вось па іх думцы адзіная перашкода для паспяховага разгортвання работ да зімы.

Як-жа на справе? Ці маюць права так супакойваць сябе кіраўнікі вагонных участкаў? Не, не маюць. Сапраўднае становішча гаворыць зусім аб іншым. Гэта выявілася з выступленняў раду членаў партыі і беспартыйных рабочых.

Дэпо не ацеплена. Дах у электразварачным цэху цячэ. Вакол свецяцца дзюры. Неадрамантаваны вароты. Нясправўнае паравое ацяпленне,—лопнуўшыя трубы. У рабоце дэпо вельмі неабходны баллгарэны варштат. Адпак, адміністрацыя не прымае мер, каб набыць яго, хаця на заводзе імя Мяснікова такі варштат стаіць нескарыстаны (работы Грыб).

Калонні па снабжэнні вадой патрабуюць неадкладнага рамонта, кранты па пуцях цякуць. Кузня працуе саматужна. Няма нават пнеўматычнага молата (рабочы Ляшчынскі). Запасныя часткі ляжаць пад адкрытым небам. Для прыходзячых на працу прыбіральніц няма нават пакоя для змены вопраткі (Матусевіч). Неналаджана справа з душам. Душ—адзін для мужчын і жанчын. У выніку—вялікая чарга (Журый).

Асабліва шмат гаварылі ў выступленнях аб нізкай якасці рамонта вагонаў. Ёсць факты, калі толькі што выпушчаныя з рамонта вагоны сарочваюцца з ближэйшай станцыі для паўторнага рамонта. Часта адпраўляюцца вагоны, у якіх цякуць трубы, няма шкла ў рамках і інш. Вялікі брак мае удзельцаў. Адна з асноўных прычын нізкай якасці работы—слабая працоўная дысцыпліна. У дэпо яшчэ не ажыта п'яніства. Аглядчык вагонаў Сонцаў, член партыі, п'янствуе, безадказна адносіцца да работы. Навіцці —лодыр, разгільдзяй. Такіх прыкладаў можна было прывесці больш. Кожны асобны факт парушэння дысцыплінарнага статута не ўспрымаюць па належную прынцыповую ацэнку.

Слаба наладжана тэхнічная вучоба. Бываюць частыя зрывы. І гэта ў той час, калі змазчыкі мала кваліфікаваныя і маюць вялікую патрэбу ў атрыманні тэхнічных ведаў, калі правадзікі не знаёмы нават з сваімі абавязкамі і г. д.

У дэпо яшчэ ёсць рад фактаў, паказваючых, што з сістэмай аплаты працы справа стаіць дрэнна. Часта малакваліфікаваны рабочы атрымлівае больш, чым высокакваліфікаваны. Ураўнілаўка яшчэ не дабіта.

Для палепшэння работы вагоннага дэпо рабочыя прапанавалі правесці шужакалейку на абмеенным пуцяе для падвозкі запасных частак і набудаваць закрыты сцяжэк для прымацавання работ на рамонту.

Выключна дрэнную падрыхтоўку да зімы паказвае ОРС. Ён фактычна не толькі не далепшыў сваёй работы пасля перабудовы, але нават не паказвае прыкладу працадзюбнасці.

Няма сумнення, што вынесеныя на парадзе недахопы ў падрыхтоўцы да зімы Менскага вагоннага дэпо парагарганізацыя на чале з палітадзелам хутка і па-баявому знішчыць.

Д.

ШЛЯХ «ПЕРАБУДОВЫ».

Перабудова ў апараце транспарта праходзіць надзвычайна марудна. Ёсць шмат выпадкаў, калі аперацыйнае жывое кіраўніцтва падмяняецца казённай цыркуляршчынай, адпіскай.

Фото-монтаж ВАЛ. МЕДВЕДЗЕВА.

7. Сякерскі

КОМСАМОЛ ПОЛЬШЧЫ ВУЧЫЦЦА У УсеЛКСМ ЗМАГАЦЦА І ПЕРАМАГАЦЬ

УсеЛКСМ, перадавая сакцыя КІМ, вядучая мільённымі масамі рабочай і сялянскай моладзі СССР, сваёй штодзённай барацьбой на фронце соцыялістычнага будаўніцтва, большэвіцкім стылем сваёй работы, умоннем ухапіцца за галоўнае на даным этапе звяно паказае прыклад усім братнім секцыям, як трэба змагацца за выкананне задач, што стаяць перад імі.

Комсамол Польшчы ў значнай меры выкарыстоўвае вопыт УсеЛКСМ у сваёй штодзённай рабоце, і гэта дапамагае яму ператварыцца ў масавую арганізацыю рабочай і сялянскай моладзі.

Комсамол Польшчы, перамагаючы сектанцкіх настрой, адолеў ва ўсіх важнейшых класавых баях, якія адбываліся ў Польшчы на апошні час (усеагульная стачка тэкстыльшчыкаў, гарнякоў, стачка ў Беластоку, сялянскія бані і г. д.), адыграв ролю арганізатара і кіраўніка моладзі. Гэта стала магчымым толькі таму, што нашы арганізацыі (праста, не ўсюды і не заўсёды) былі цесна звязаны з заводамі, вялі балючай моладзі і пры дапамозе канкрэтных, рэальных і папулярных патрабаванняў моладзі (не знаёмых вверху, а выпрацаваных на парадах з беспартыйнай моладдзю) пра юнацкія органы барацьбы ў выхаванне юнацкіх камітэт і стачачных делегацый, якія карыстаюцца даверам мас, адолелі раскачаць і актывізаваць моладзь у барацьбе усяго пролетарыята.

Там, дзе нашы арганізацыі і ячэйкі разумелі пільнасцю масавага руху (гэта адносіцца ў першую чаргу да ваенскай і дамброўскай арганізацый), там яны з'яўляюцца сапраўднымі памочнікамі партыі. І заслугай УсеЛКСМ з'яўляецца тое, што ён мацнуў польскаму комсамолу прынцыпы правільных узаемаадносін партыі і комсамола, будучы сам верным памочнікам партыі.

Восенню мінулага года партыя рыхтавала ўсеагульную забастоўку тэкстыльшчыкаў, расчыняючы для абвяшчэння масавай стачкі, ахапляючай 25 тыс. тэкстыльшчыкаў, было спынене некалькіх важнейшых заводаў, у першую чаргу Відзеўскай мануфактуры, самай буйной тэкстыльнай фабрыкі ў Лодзі. Партыі ўдаецца спыніць толькі працэсіі. Ткацкія цэхі працуюць далей. У КСМП добрая ячэйка ў так званай Малой ткальні, дзе працуе выключна моладзь. Ячэйка склікае агульны сход на Малой ткальні і высоўвае «канкрэтныя патрабаванні для моладзі ткацкага цэха. Малая ткальня далучаецца да стачкі. Выбраецца стачачная камісія з 10 чал. Але галоўнай задачай з'яўляецца далучэнне да стачкі Вялікай ткальні, дзе працуюць і моладзь і старэйшыя рабочыя. Юнацкая стачачная камісія пры дапамозе парад і масоўкі ўцягвае ў стачку спачатку толькі моладзь з Вялікай ткальні (буйную ролю адыгралі патрабаванні для маладых ткачоў), потым пры дапамозе моладзі ў стачку былі ўцягнуты старэйшыя рабочыя. Гэта вырашыла пытанне аб стачцы на ўсёй Відзеўскай мануфактуры і хутка ўцягнула ў стачку і іншыя фабрыкі.

На жаль, у нас яшчэ мала ячэек, працуючых так, як ячэйкі на Відзеўскай і Шлосераўскай мануфактурах. У нас ёсць яшчэ арганізацыі, адарваныя ад жыцця прадпрыемстваў. Прыкладам такой арганізацыі можа быць наша арганізацыя на Повісле ў Варшаве, якая толькі з газет давядалася, што на не тэкстыльні выбухнула стачка на фабрыцы Рулскага (май мінулага года) і што рабочыя заняілі фабрыку.

Барацьба за масы моладзі, што знаходзяцца ў масавых буржуазных арганізацыях, высунутае на першае месца снежанскім пленумам ВЦКСМ, цесна звязана з прыцэпам масавасці руху. Большасць нашых арганізацый або нагоды не працуюць, або працуюць яшчэ па-сектанцку у масавых арганізацыях моладзі.

Апошнія некалькі месяцаў далі нам шмат прыкладаў, як трэба зазаўзяць моладзь, якая знаходзіцца ў буржуазных арганізацыях. Наша арганізацыя ў Валоміне (Варшава-Прыгарадная) з дапамогай некалькіх нашых таварышоў, якія з'яўляюцца членамі «Стралка», здолела разгарнуць там масавую работу. У склад «Стралка» (буржуазная паўфашысцкая арганізацыя) увяходзіць галоўным чынам беспрацоўная моладзь. Вельмі многіх удалося прыцягнуць у «Стралок» абіцаннем даць работу.

10 чэрвеня г. г. перад магістратам адбываецца масавая дэманстрацыя беспрацоўных, занятых на прамадзкіх работах, супроць скарачэння і затрымкі зарплаты. Скарачэнне захватвала ў першую чаргу моладзь. Комсамольцы дабіліся таго, што і «стралкі» прынялі ўдзел у гэтай дэманстрацыі. 12 чэрвеня адбылася новая дэманстрацыя, якая выставіла патрабаванне работы для ўсіх. Калі камісар магістрата пачаў пагражаць, што паліцыя будзе страляць, з натоўпа пачуліся воклічы: «Стралкі, у казармы на выбор!» Камісар, жадаючы супакоіць натоўп, звярнуўся да яго з прамовай, у якой, між іншым, сказаў, што немагчыма даць работу ўсім, бо «дзяржава бедная». «Стралкі» перарвалі яго крыкам: «А на вайну ў вас срэдкі ёсць?»

Гэты прыклад паказвае, як, уцягваючы моладзь з фашысцкіх арганізацый у штодзённую класавую барацьбу за патрабаванні, якія з'яўляюцца патрабаваннямі той-жа моладзі, мы зазаўзем гэту моладзь для справы пролетарыята.

Возьмем другое пытанне — рэвалюцыйны інтэрнацыяналізм. УсеЛКСМ, які развіўся над непасрэдным кіраўніцтвам Леніна і Сталіна, уніёс у міжнародны рух моладзі сапраўдны пролетарскі інтэрнацыяналізм, прынцыпы большэвіцкай барацьбы з імперыялістычнай вайной.

Гэта мае велізарнае значэнне для нас, польскіх комсамольцаў, іменна цяпер, калі польская буржуазія, распальваючы шавіністычныя і нацыяналістычныя пачуцці, прабуе адарваць моладзь ад класавай барацьбы і выкарыстаць яе ў імперыялістычных мэтах. У сувязі з прыходам да ўлады Гітлера ўсе буржуазныя партыі, усе буржуазныя арганізацыі моладзі, а таксама ПШС і ТУР, вядуць жорсткую шавіністычную кампанію супроць Германіі, жадаючы ў імперыялістычных мэтах выкарыстаць нянавісць працоўных мас Польшчы супроць злоснага тэрора фашысцкай дыктатуры ў Германіі. Увесь буржуазны друк крычыць аб «здрадзе» польскіх комуністаў, якія змагаюцца за права прыпечатаных нацый на самавызначэнне аж да адзяляння Паморэ'я, Верхняй Сілезіі, Заходняй Украіны і Беларусі. КСМП пад кіраўніцтвам партыі стаіць сяўхільна на пазіцыях інтэрнацыяналізма, арганізуе ў першую чаргу барацьбу супроць «свайго», польскага фашызма, прапагандуе салідарнасць рабочай моладзі Польшчы і Германіі супроць агульнага ворага — фашысцкай дыктатуры. Наша слабасць заключаецца ў тым, што мы яшчэ не разварушылі супроць шавіністаў асноўных мас моладзі.

Мы яшчэ не перамаглі таксама многіх недахопаў у галіне нашай ваеннай работы. Але апошнія нашы дасягненні і вопыт работы сярод цапрызыўнікаў і салдат, барацьба супроць ваеннай падрыхтоўкі і «Стралка» ўказваюць на тое, што комсамол пры вялікім намаганні зможа значна палепшыць артыўаеную работу.

Комсамол Польшчы вучыцца ў УсеЛКСМ жывому, аперацыйнаму кіраўніцтву. Рашэнні нашэ ЦК абмяркоўваўся тым, што даваў указанні таварышам, якія адпраўляюцца на акруговую работу, і атрымліваў ад іх справаздачы. Зараз мы навучыліся кіраваць у залежнасці ад канкрэтнай сітуацыі, канцэнтраваць усе свае намаганні на самым галоўным у даны момант участку работы. У часе статкі тэкстыльшчыкаў і гарнякоў мы паслалі нашых лепшых актывістаў у Лодзь і Дамброўу. Восенню мінулага года, калі па ўсёй Польшчы пракацілася хваля стачак, сялянскіх байкотаў, злучаных з крывавымі стачкамі з паліцыяй, і нашы вясковыя арганізацыі былі зусім пасіўны ў гэтай барацьбе, ЦК, звярнуў шы асаблівую ўвагу на гэты заклінуты ўчастак работы, сканцэнтраваў лепшых актывістаў у аграрных акругах, разбіў гэтыя акругі на больш дробныя прыходам да ўлады Гітлера ўсе буржуазныя партыі, усе буржуазныя арганізацыі моладзі, а таксама ПШС і ТУР, павышэння актыўнасці вясковых арганізацый.

УсеЛКСМ навучыў нас пераносіць вопыт асобных арганізацый і ячэек на ўвесь саюз. Прыклад нашай арганізацыі на Шлосераўскай мануфактуры, прыняўшай актыўны ўдзел у стачачнай барацьбе, мы папулярызавалі ва ўсёй арганізацыі, і гэта ў значнай ступені зрабіла ўплыў на павышэнне актыўнасці многіх нашых ячэек у стачках. Вопыт стачак на заводах мы перанесём у вёску, у маёнткі. У апошні час былі стачкі батрэкоў, у часе якіх высоўваліся патрабаванні для моладзі, і дзеляцыі моладзі ўваходзілі ў склад стачкомаў. Неабходна адзначыць, што нашы намаганні ў гэтай галіне яшчэ недастаткавыя.

Вылучэнне і выхаванне новых кадраў комсамольскага актыва, дасканала пастаўленая на УсеЛКСМ, праходзіць у нас слаба, плённа. Можна адзначыць толькі некаторае паляпшэнне ў гэтай галіне. Мы ўзялі актывы стаў Шлосераўскай мануфактуры ў акруговыя камітэты не толькі Лодзі, але і Варшавы. У некаторых райкомах ёсць сапраўдныя важкі моладзі, якія выраслі ў стачках, у барацьбе беспрацоўных, у барацьбе вясковай беднаты і батракоў.

Ініцыятыва і самастойнасць кожнай ячэйкі для комсамола Польшчы, які знаходзіцца ў нелегальных умовах, калі ў сувязі з правалам арганізацыі вельмі часта адарваны ад прыфабрычных станцый, маюць асаблівае, надзвычай важнае значэнне. Лодзінская і дамброўская арганізацыі ўжо не раз даказалі, што ўмеюць самастойна вельмі многае зрабіць. Арганізацыі-ж прамысловых акруг нерашучы і неініцыятыўны.

Польскі комсамол павінен яшчэ многаму навучыцца ў УсеЛКСМ у справе разгортвання самакрытыкі знізу ў ніз, замацэнняе ідэалагічнай пільнасці. Не гледзячы на тое, што наш КСМ ідэалагічна загартаваўся ў барацьбе, ляўо ён яёў ад кіраўніцтвам так званай меншасці ў ЦК КПП супроць правых (1926-1929 г. г.), мы ўсё-ж, прымаючы пад увагу ісцнаванне ў варшаўскай арганізацыі кастжэнт

Забяспечыць штодзённае, аперацыйнае кіраўніцтва школамі

ШКОЛА ПАТРАБУЕ ШТОДЗЕННАЙ УВАГІ

Падрыхтоўка да навучальнага года ў школах у гэтым годзе прайшла значна лепш і арганізаваней, чым у мінулыя гады. Школы стала цэнтрам увагі ўсёй пролетарскай грамадскасці. У гэтым годзе значна шырэй прыцягнуты грамадскія арганізацыі, рабочыя, калгаснікі ў дапамогу школе для правядзення своечасовага рамонту, абсталявання і стварэння спрыяючых умоў для работы школы. З атрыманнем стабільных падручнікаў, пастаянных праграм і навучальных планаў значна палепшылася матэрыяльная база школы. Пераважная большасць школ па БССР сустрэлі дзеўтару падрыхтаванымі і з першых дзён пашлі нармальныя заняткі. Падрыхтоўка і пачатак заняткаў праходзілі пад кутом глядзання — зрабіць гэты год апошнім годам ліквідацыі нарэшце нагадохла школы. Але ўсё гэта ні ў якім разе не дазваляе нам супакоіцца, аслабіць увагу да школы. Наадварот, патрабуецца яшчэ больш канкрэтнае кіраўніцтва, дапамога, трэба ўвайсці ў асобныя дэталі школьнага жыцця і працы, бо далёка не ўсё яшчэ зроблена для нармальнай работы школ. Матэрыялы, якія мы сёння змяшчаем, зусім ясна паказваюць, што ва многіх раёнах раённыя камітэты партыі, аддзелы народнай асветы, прафсаюзныя арганізацыі, сельскія саветы ўжо павяркуліся спіной да школы. Больш таго, у некаторых месцах проста значына аднеслі ся да скачання будаўніцтва новых школ, рамонта старых, камплектавання настаўнікамі, пытання своечасовай выплаты пенсіі настаўнікам, нармальнага іх забеспячэння і г. д.

Т. т. ГІКАЛО і ГАЛАДЗЕД у сваёй тэлеграме на імя сакратароў райкомаў і старшынь РВК катэгарычна прапанавалі да 1 верасня скончыць будаўніцтва новых школ. Ва многіх раёнах да гэтай дырэктывы аднеслася па-нерпавацельску. Так, у Буда-Кашалёўскім раёне ні адна школа не скончана, а павінны былі быць скончаны тры. Яшчэ горш, стары будынак школы ў Буда-Кашалёве з ведама РК і РВК перадан пад квартэру тэхніку, таму самому, які сарваў скончанне школы ў раёне. Школу помасцілі ў незакончаны будынак, без дзвярэй, вокнаў і печак. І райана лічыць, што навучальны год распачат зусім нармальна. Буда-Кашалёўскі раён не адзін. Па ім раўняюцца Аршанскі, Смаляві́цкі, Старобінскі. Ва многіх месцах яшчэ не ліквідаваны антыленінскія адносіны да настаўніка. Загадчык Касцюковіцкага райфа тав. Новікаў забараніў сельсавету выдаваць пенсію настаўнікам і з пачатка месяца настаўнікі не атрымліваюць пенсіі. У Мсціслаўскім раёне, у Мазолаўскім сельсавеце паўтара месяца ніякага пайка настаўнікам не выдаюць. Настаўніцкія пайкі разбазараюцца, перадаюць іх на іншыя мэты, а прафсаюзы не прыцягваюць да судовай адказнасці гэтых арганізацый бюракратаў. Саюз працаўсветы не разгарнуў сапраўднай барацьбы за паляпшэнне матэрыяльна-бытавых умоў настаўнікаў.

Шмат школ да гэтага часу яшчэ не ўкамплектаваны поўнасцю настаўнікамі і фактычна ў іх навучанне не працякае нармальна. Некаторыя райана, як аршанскі, бялыніцкі, менскі з невыстарчальнай колькасцю пільнасцю аднеслися да ўкамплектавання школ загадчыкамі і выкладчыкамі. У выніку мы маем цэлы рад антысавецкіх праяўленняў у школах і зусім слабае рэагаванне на іх.

Вывад ясны. Нельга супакойвацца на дасягнутых поспехах у школах. Раённым камітэтам партыі, НКА і яго райаддзелам неабходна зараз-жа прыняць тэрміновыя заходы для нармальнай работы ўсіх школ, з усёй рашучасцю вытрушыць кампанейшчыну ў адносінах да школ. Работа аддзелаў народнай асветы і саюза працаўсветы павінна быць перабудавана так, каб ведаць і кіраваць работай кожнай школы штодзённа.

ВЫГНАЦЬ ЧУЖАКОЎ

Менск. 39 школа, падшэфная паравознаму дэпо, дрэнна падрыхтавалася да навучальнага года. Рамонт школьнага будынка не зроблен, дах працякае, а гэта, закуплена для пакрыцця даха, ляжыць незвезеная ў Чэрвені. Падручнікамі школа забяспечана на 40 проц.

Майстэрні (сталярныя, механічныя) не абсталяваны, няма нічога падобнага на політэхнізацыю. З боку партыйнага, прафсаюзнага і гаспадарчага кіраўніцтва дэпо няма ніякай дапамогі школе. Да сённяшняга дня на пат не заключан дагавор паміж школай і дэпо.

У школе распаўсюджаны контр-рэвалюцыйныя сутарэі і справы. Матэрыяльная дапамога, якая аказваецца дзецям, ідзе ў першую чаргу для дзяцей былых спекулянтаў і кулакоў. Усе гэтыя справы робяцца таму, што настаўніцкае калектыўна вельмі засмечана класова-чужымі элементамі. ГарАНА як былым узяўся за ачыстку настаўніцкага склада, але з-за сваёй палітычнай блізарукасці ён «не знаёшу» чужакоў.

Яшчэ і зараз у школе «працуе» былы заг. школай Кірык — класава-чужы элемент. Да 1930 года гэты Кірык захоўваў у школьных шафах евангелі. У 1932 г. у яго знайшлі ў шафе партрэт Мікалая II і кнігу, прысвечаную 300-годдзю дома Раманавых. У 1931 г. Кірык зрабіў значную ахвяру ў дапамогу высланаму за контр-рэвалюцыйную дзейнасць нейкаму архірэю. За ўсё гэта яго звялі з загадвання, але пакінулі настаўнікам.

Бяздзейнасць арганізацый дэпо і слепата ГарАНА праюць на руку шкоднікам. Кожсамольская арганізацыя дэпо не кіруе работай піанербазы і комсамольская ячэйкай школы.

Усе гэтыя факты гавораць за тое, што справа выхавання дзяцей у 39 школе перадана ў рукі класавых ворагаў. Неабходна зараз-жа ачысціць 39 школу ад гэтых класава варожых элементаў.

ШАМЕС.

ТАМ, ДЗЕ НЯМА БОЛЬШЭВІЦКАГА КІРАЎНІЦТВА

Новы навучальны год у большасці арташскіх школ горада і раёна сустрэлі непадрыхтаванымі. З-за незакончанасці рамонта школ, з-за несваячасовага прызначэння настаўнікаў арыяцца работа цэлага раду школ і да гэтага часу. Гуровская школа пачала заняткі 15 верасня, Жалязоўская школа—у канцы верасня, у 2-й узорнай ФЗС да сёгэтага часу няма настаўніка мовы і літаратуры, у Баранскай ФЗС толькі 25 верасня быў прызначан настаўнік літаратуры, у 4-ю ФЗС настаўнік матэматыкі быў прызначан 15-IX. Какоўчынская ШКМ не мела настаўніка да канца верасня. Вось далёка няпоўны пералік школ, у якіх навучальны год пачаў несваячасова.

Да падбора загадчыкаў школ райАНА аднёсся нядбайна. Загадчыкам навучальнай часткі 11-й узорнай ФЗС прызначан Шапавалаў — выключаны з партыі, заняты з працы у Чашніках і Віцебску за разлажэнне школ, папойкі і растрату. Загадчыкам 6-й ФЗС быў прызначан чалавек невядомы, які не мог згуртаваць калектыва, наладзіць работу і дзэрталаў. Загадчыкам вошыцка-практыкавальнай школы прызначан Міхнеіч, чалавек з неправільным мінулым, які на працягу месяца разлажыў работу школы, арыяў заняткі, уводзіў у сваёй групе 2-х гадзінныя «фізкультмінуткі».

Са школ раёна, наводле няпоўных вестак, уцякло 18 настаўнікаў з-за зрыва забеспячэння, з-за несваячасовага вызначэння бюджэта для нова адкрываемых камплектаў. Загадчык райАНА Підарэнка застрахоўвае сябе пісаннем дакладных запісак у раённыя арганізацыі. У гэтым яму дапамагае старшыня РК саюза Гозман.

Паміж дашкольным выхаваннем і школьным навучаннем існуе вялікі разрыў. Існуючыя ў горадзе тры 0 групы могуць ахапіць толькі 25 проц. ды пушчаных з дашкольных устаноў.

Кіраўніцтва нацменаўскімі школамі выпала з пад увагі райАНА. У Жалязоўскую беларуска-польскую школу накіраван настаўнік толькі ў канцы верасня. У Копыскую яўрэйскую школу накіроман загадчык, які ўжываў фізічныя меры ўздзеяння. Зараз ён знят з працы, але другі загадчык не накіроман. 6-я руская ФЗС не забяспечана падручнікамі і на працягу месяца не мела загадчыка. Прамадазнаўства ў школе да гэтага часу не выкладаецца.

З боку райАНА няма належнага рэагавання на цэлы рад класава-варожых вылазак, меўшых месца ў радзе школ. Антысеміцкі выпад з боку заг. вошытна-практыкавальнай школы Міхневіч адбыўся ўжо больш як 10 дзён назад, а Підарэнка, добра ведаючы аб гэтым, не рэагуе і не хоча рэагаваць.

Гарачыя снеданні не толькі ў вёсцы, але і ў горадзе не арганізаваны ў боль шасці школ, а дзе арганізаваны — ахапляюць 30-40 проц. дзяцей.

Да 1 кастрычніка райАНА не паладзіў уліку дзяцей, падлягаючых навучанню, не правёў разнавання гарадзкіх школ, не забяспечыў ахвата ўсіх дзяцей усеагульным навучаннем.

Палітэхнічнае навучанне існуе на паперы — да гэтага часу школы не прымацаваны да прадпрыемстваў. Паміж школамі і прадпрыемствамі не заключаны дагаворы, у большасці школ сямігодак няма майстэрань, а ў 1 канцэнтры — рабочых пакояў.

Загадчык райАНА тав. Підарэнка яўна ігнаруе пастановы настаўніцкай канферэнцыі. Знятага з работы за разлажэнне школы, вялікага з саюза і аддзела пад суд настаўніка Матыста ён прызначыў загадчыкам завяжуўскай ШКМ. НКА, райкому партыі неабходна прыняць тэрміновыя меры.

Група настаўнікаў.

САРВАЦЬ МАСКУ З ПЕРАРАДЖЭНЦА КУРЫЛОВІЧА І ШКОДНІКА ЧУБРЫКА

11 жніўня ў артыкуле «Палітаддзел» «Звязда» пісала аб першых кроках работы палітаддзела саўгаса імя Дзяржынскага і аб антыпартыйных адносінах да яго з боку дырэкцыі саўгаса.

Пасля пашырэдзіраванай перагічэйкі саўгаса, райкома партыі і «Звязды» дырэктар Курыловіч прызнаў свае памылкі, абяцаў на практычнай рабоце іх выправіць. Аднак, выконваць указтыя на сябе абавязкі Курыловіч і не збіраўся. Замест адкрытай барацьбы супроць палітаддзела, дырэкцыя пачала дыскредытаваць і ашкаляць яго работу. Усялякія патрабаванні, заўвагі і дасланыя практычныя парады палітаддзела дырэкцыя сабатавала.

Пароўнем да фактаў.

Палітаддзел, на аснове дырэктыў партыі і ўрада, своечасова ўзняў пытанне аб складанні планаў гаспадарчых работ, канкрэтна дапамог рацыянальна расставіць рабочую сілу, таб з большым поспехам выконаць сельскагаспадарчыя работы. Аднак, дырэкцыя, асабліва нам, дырэктара—агранома Чубрык, на справе гэтым не кіраваўся, наадмысла стараючыся адлянуць гаспадарчыя работы. Азімая сяўба зацягнулася да сярэдзіны кастрычніка; бульбакапанне пачалося са значным спазненнем, без належнай падрыхтоўкі.

Праводзячы гэту шкодную работу, дырэкцыя, асабліва Чубрык, пашыралі сярод рабочых чуткі, што ва ўсім гэтым шпіцуе палітаддзел, што «як не было палітаддзела, усё добра было, а зараз скрозь прарывы». Што палітаддзел, моў, умешваецца не ў свае справы, перашкаджае працаваць і г. д.

У саўгасе па-шкодніцку ігнаруюць ся сазвароты. На вытворчай нарадзе Чубрык заявіў, што сазваварот перашкаджае выкананню гаспадарчых работ. Тут-жа ён прапанаваў, што трактары пашэнаюць урадзайнасць, што яны дрэнна працуюць і таму на саўгаснай глебе іх нельга выкарыстоўваць. І таму ў саўгасе прастойваюць трактары і механізмы напружаецца конская рабочая сіла. Так, напрыклад, 29 верасня Чубрык аддаў з поля два трактары, заўважыўшы, быццам яны не могуць працаваць. І толькі пры ўмяшанні сакратара палітаддзела трактары былі звернуты назад на поле, і працавалі добра. За якасцю ворыва дырэкцыя не сочыць, бракажа няма. Дрэнная работа та не бракуецца.

Характэрна, дырэкцыя апрымала ад трэста прапанову тэрміновага паведаміць, якія машыны і запасныя часткі патрэбны саўгасу. Чубрык, які пасоўл ігнаруе яную-б там ні было механізацыю ў саўгасе, гэта паведамленне трэста схаваў і нічога палітаддзелу пра гэта не гаварыў. Таму і зараз запасных частак да трактараў няма, бо дырэкцыя не знайшла патрэбным адпусціць грошы для іх куплі. Зараз калі, трэба пяцідзіцуць падшыпнікі, трактар кінуць, або два прастойвае, бо на ключ трэба бегчы на другі ўчастак.

У саўгасе ігнаруецца радковая сяўба. Скарыстоўваюцца толькі раскідныя сеялкі. Зноў-такі па прычыне, што «У нас мокрае поле, і радковыя сеялкі сеяць нельга»—заяўляе Чубрык.

Сістэматычнага рамонта інвентара няма. Калі выначаюцца рабочыя для рамонта, Чубрык іх знімае і пасылае на іншую работу.

Дырэкцыя не лічыць патрэбным рабіць копіі: «Нашы коні і неканамі могуць працаваць». Не было летам пасбіраў для коней і кароў. Чубрык у сваім шкодніцкае дайшоў да таго, што даваў конюхам сакрэтныя указанні заменшыць нормы кармоў. Прыйшлося палітаддзелу ўмяшацца ў гэту справу, каб адмяніць злачынныя дырэктывы Чубрыка.

Дырэкцыя ігнаруе адзельнічыну, вытворчыя брыгады, сацыялістычныя метады працы. Пад націскам палітаддзела ў саўгасе былі арганізаваны дзве вытворчыя брыгады. Але на практыцы Чубрык арганізаваў работу так, што лідэры механізма перакідваліся з адной брыгады ў другую. Бывала і так, што брыгада працуе ў полі, а брыгадзір на цэнтральнай сядзібе.

Дырэкцыя ўвесь час сабатавала пераход на адзельную аплату. Прыйшлося антрафаваць Чубрыка, для таго каб прымусіць яго арганізаваць адзельную аплату. Але і пасля гэтага ён работу правёў толькі фармальна, а адзельшчыны фактычна і па сённешні дзень няма.

Чубрык марынаваў і ўтойваў ад палітаддзела рапарты аб прагулах тых ці іншых рабочых. Акты на патравы далей Чубрыкова стала не пашлі.

Саўгасная зямля самавольна заворвалася аднасобнымі і кулацкімі гаспадаркамі. Чубрык пра гэта ведаў, але ад палітаддзела ўтаіў. Прыйшлося палітаддзелу, паміма дырэкцыі, выклікаць каморніка з райаза, які ўстанавіў, што аднасобнымі і кулацкімі гаспадаркамі ўзарана звыш 20 га саўгаснай зямлі.

Яшчэ ўлічаткаў вораг'я палітаддзел і шматтыражка «Ударнік саўгаса» пачалі гаварыць аб падрыхтоўцы да правядзення бульбабоўкі. Дырэкцыя здагадалася з усімі доказамі, але нічога практычнага не рабіла. Бульбакапалі ўжо тры гады стаяць, іх не выкарыстоўваюць, бо Чубрык і Курыловіч дазваляюць аб іх непрыгоднасці, аб тым, што саўгасную бульбу яны выбіраць не змогуць.

Два гады таму назад за 7.000 руб. купілі лакамабіль для свінафермы № 1. Але на гэты дзень лакамабіль не працуе. Колькі разоў дырэкцыя ездзіла ў Слуцак, падрабны дробязі для таго, каб лакамабіль пусціць у ход, але гэтыя дробязі не купілены.

У саўгасе зрываецца будаўніцтва. Курыловіч у свой час згадкаўся па на будову лазні для рабочых і скончанне яшчэ пачатага будаўніцтва. Пра гэта ён заявіў у палітаддзеле. А калі прыехаў у саўгас прадстаўнік па будаўніцтву, ён заявіў, што саўгас сёлета нічога будаваць не будзе (між іншым, гаснія ўжо «будуецца» трэці год). У прысутнасці рабочых Курыловіч абазваў дзесятніка Барысевіча, які патрабаваў у дырэктара дапамогі па будаўніцтву.

План эдачы таварнай прадукцыі па свінаферме на 1934 год быў складзен яўна перапаменшаны. Курыловіч зацвер жыў план здачы мяса ў 1.505 цэнтн. Палітаддзел з гэтым планам не згадзіў ся. План быў вынесен на абмеркаванне вытворчай нарады з удзелам усіх рабочых, пасля чаго план быў зацверджаны ў колькасці 2.111 цэнтн.

Выкулена лучае шкодніцтва пры спіртаванні збожжа. Калі 10 гектараў пораджанага жыта было звезена у сыроту, дрэнна складзена, абыяк накрыта, а ў выніку ўсё гэта зацвяло і каля 25 проц. збожжа прарасло. Курыловіч, які бачыў як Чубрык кіраваў гэтым шкодніцкім сцірпаванкем, ніякай увагі на гэта не зварачаў.

На ст. Слуцак прыбыў для саўгаса 1 вагон штучнага ўгнаення. Замест таго, каб безадкладна арганізаваць вывазку ўгнаення, саўгас на ўсе патрабаванні станцыі пруа не забіраў. Станцыя была вымушана ўзнаенне распрадаць, ад чаго саўгас пацярпеў страты на 4.000 руб.

Слуцкая база Саюзтранса растранжыра каля 500 пудоў саўгаснага корма. Сярэна была перагнана ў суд для прыцягнення вінаватых да адказнасці. Але Курыловіч чамуюці тэту справу спыніў і вінаватых дагэтуль не пакараны.

Падобных фактаў можна было-б указаць значна больш. Але і яны давоі яра характарызуюць кіраўніцкую саўгаса і ўмовы, у якіх прыходзіцца палітаддзелу працаваць.

У бяліцкай барацьбе са шкодніцкімі элементамі палітаддзел заваёўвае аўтарытэт у рабочых саўгаса, згуртаваў вакол сябе актыў перадавых рабочых-ударнікаў, усіх партыйцаў і комсамольцаў, але ў такіх умовах працаваць вельмі цяжка.

Таму без карэнных змоны кіраўніцтва гаспадаркі надалей развіцця не можа. Цяперашняя кіраўніцкі саўгаса Курыловіч і Чубрык вядуць гаспадарку да развала.

Начальнік палітаддзела **ШНІТКО.**
Пам. начпалітаддзела па партработе **ГАЛУБІЦКІ.**
Пам. начпалітаддзела па комсамолу **РУДНІЦКІ.**
Рэдакцыя шматтыражкі «Ударнік саўгасаў» **ПЕЛІНСКІ.**

Саўгас імя Дзяржынскага, Капыльскі раён.

ПА ДАКЛАДУ ВАЕНКОМА ПАДШЭФНАГА ЎРАДУ БЕЛАРУСІ ЛІНКОРА „ПАРЫЖСКАЯ КОМУНА“ АБ ВЫНІКАХ БАЯВОЙ І ПАЛІТЫЧНАЙ ПАДРЫХТОЎКІ

Пастанова Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта і Савета Народных Камісараў БССР

Заслухаўшы даклад ваенкома падшэфнага лінкора «Парыжская комуна» тав. Бакуліна аб выніках баявой і палітычнай падрыхтоўкі на караблі, Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Совет Народных Камісараў БССР з асаблівым задавальненнем адзначаюць вялізарную большэвіцкую работу чырвонафлотцаў, камандзіраў і палітработнікаў карабля, праробленую ў гэтым годзе па аўладанню складанай ваенна-марскай тэхнікай. Адсутнасць аварый і паломак механізмаў на працягу ўсяго года заваявана асабовым складам карабля на аснове патрэбнага большэвіцкага аўладання тэхнікай.

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Совет Народных Камісараў БССР патрэбуюць ад усяго асабовага складу падшэфнага лінкора замацаваць гэтыя вялізарныя дасягненні і ў будучым вучэбным годзе яшчэ больш настойліва працаваць над далейшым тэхнічным ростам байцоў, камандзіраў карабля, над асвоеннем той новай тэхнікі, якую карабель будзе атрымліваць ад пролетарскай дзяржавы.

Адзначаючы моцнае палітыка-маральнае становішча і ўзрослую ваенскую дзеяздольнасць, Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Совет Народных Камісараў БССР звяртаюць увагу камандавання і ўсіх байцоў карабля на неабходнасць далейшага павышэння палітычнага і культурнага ўзроўня байцоў і камандзіраў, узмацнення барацьбы за вайсковую рэвалюцыйную дысцыпліну, з тым, каб зрабіць лінкор узорным, дысцыплінаваным караблём мерных сіл Чорнага мора.

Для аказання дапамогі ў матэрыяльным, культурным і палітычным абслугоўванні патраб чырвонафлотцаў і камандзіраў падшэфнага лінкора «Парыжская комуна», Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Совет Народных Камісараў БССР **пастанаўляюць:**

1. Выдзеліць з рэзерваў БССР і адгрузіць 500 тон бульбы для патрэб асабовага складу для палепшэння харчавання. Адгрузку робіць помсамол Беларусі.
2. Не пазней 1-га квартала 1934 г. выдзеліць карабля адну лёгкавую машыну.
3. Выдзеліць у распараджэнне камандавання 10.000 руб. для прамяванняя ў 16-ю гадавіну Кастрычніцкай рэвалюцыі лепшых ударнікаў чырвонафлотцаў і камандзіраў за узорныя поспехі баявой работы ў 1933 г.
4. Адпусціць для абсталявання казарм, клуба і лёгкавіку 20 тысяч рублёў, адзін вагон фанеры і 20 вагонаў лясных матэрыялаў.
5. Для азнаямлення працоўных Беларусі з жыццём, бытам і рэчобай падшэфнага лінкора абазвацца Дзяржаўнае Выдавецтва Беларусі разам з ЦК ЛКСМБ выпусціць да гадавіны Беларусі папулярную кнігу аб падшэфным караблі.

Складанне матэрыялаў гэтай кнігі і кантроль за не выданнем усялясці на ваенкома падшэфнага лінкора тав. Бакуліна.

6. Прасіць Рэвваенсавет Чорнага мора выдзеліць у БССР маестэрска-культурныя сілы лінкора «Парыжская комуна» для азнаямлення працоўных БССР з іх работай.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР
А. ЧАРВЯКОЎ.
Старшыня Совета Народных Камісараў БССР **М. ГАЛАДЗЕД.**
Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР **М. ЛЯКУКОЎ.**

ПАБУДУЕМ З СКАДРЫЛЬЮ імя тав. КАГАНОВІЧА

На бягучым рахунку—1.097.191 руб.

За ўчарайшы дзень на бягучы рахунак № 160/7814 паступіла 9.044 руб. ад арганізацый, устаноў і прадпрыемстваў Менска—470 руб., з раёнаў: Барысаўскага 1750 руб., Лёзненскага—884, Рэчыцкага—100, Бярэзінскага—982, Бабруйскага—1500, Суражскага—256, Парыцкага—1237, Касцюковіцкага—559, і Хойніцкага —1270 руб

ДА XVI КАСТРЫЧНІКА ЗАВАЯВАЦЬ ПРАВА НА РАПАРТ

(«ПРАМЕНЬ КОМУНІЗМА»—ШКЛОЎ)

Шклоўскі раён — адзін з найбольш адстаючых па рэалізацыі прапановы рабочых і калгасных мас БССР па пабудове эскадрыльі імя тав. Кагановіча. Збор сроднаў тут праходзіць недапушчальна марудным тэмпамі. За ўвесь час раён перавёў усяго на бягучы рахунак каля 2.000 руб. Сума — больш чым невыстарчальная. «Звязда» не раз указвала на ганебнае адставанне раёна.

Здавалася-б, газета «Прамень комунізма» — орган РК КП(б)Б, РВК і РПС, улічыць указанні і разгорне аддавадна масава-растлумачальную і аперацыйную работу. На справе-ж нічога падобнага не было. Перадрукаваўшы 3-га жніўня зварот гомельскіх рабочых і калгаснікаў, газета палічыла на гэтым сваю агітацыйную і арганізуючую работу закончанай. Ніякімі каментарыямі «Прамень комунізма» не суправаджаў зварот.

29 жніўня газета змяшчае інфармацыйную заметку, у якой спакойна даведзіць, колькі сабрана сроднаў. Аказваецца, агульная сума збора па раёну складае ўсяго 514 руб. Газету гэта нікольні не турбуе. Яна праштампавала і супакоілася. Цэлы месяц на старонках газеты не было ні радка.

Толькі 29-га верасня «Прамень комунізма» змяшчае чарговую заметку, у якой робіць спробу паказаць прычыны адставання. Раён сабраў усяго 1.346 р. Такім чынам, за месяц паступіла толькі каля 800 руб. Тэмпы паступлення яўна невыстарчальныя. Але газета аб гэтым не гаворыць. Яна прызнае, што толькі «за апошні час збор значна асляб». Паказаўшы на рад сельсоветаў, якія не ўнеслі ні капейкі, газета заключае: «Неабходна арганізаваць справу так, каб у бліжэйшыя дні поўнасцю скончыць збор сроднаў».

Можна было чакаць, што газета адразу пераключыцца на аперацыйнае кіраўніцтва, на барацьбу за рэалізацыю высунутай задачы, возьме пад кантроль ход кампаніі па адстаючых сельсоветах, выявіць канкрэтных вінаватых слабага разгортвання работы. Але гэтага не было. Газета на другі дзень закінула кампанію. Разам з гэтым спыніў ся і збор сроднаў. Успомніла, яна аб кампаніі толькі 18 кастрычніка, пасля трох тыдняў. Не дзіва, што ёй прышлося на гэты раз зноў прамянстаравацца, што «тэмпы збора сроднаў ні ў якім разе нельга прызнаць здавальняючымі» і перапічыць адставанне тых-ка самых сельсоветаў, што і тры тыдні таму назад.

Аднак, нават і пасля гэтага і па сённешні дзень, не гледзячы на тое, што па раёну фактычна праваляваецца кампанія, газета яшчэ не ўзяла гэту справу на прынцыпова-палітычную высыню. Няма ніякіх апраўданняў такой ганебнай рабоце па збору сроднаў, якая ёсць на Шклоўшчыне.

Да 16-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі пролетарыят і калгасныя масы БССР павінны і будуць разгортваць аб поўным завяршэнні збор сроднаў.

П. ШАСТАКОЎ

ПАРАШУТЫСТ

Гэта была адна з тых сустрэч, якія не забываюцца, якія апём прасякаюць істоту, пазбаўляюць жылы маладой гарачай крыві, выпрастваюць постаць, нутра ўсміхаюць галаву, асвятляюць шлях тысячамі сонцаў і рушаць уперад напорнай хадою.

...Старшыня ўрачыстага вечара не адразу ўстаяў належную цішыню, каб даць слова новаму прамоўцу. Магор дружбы шэфа—рэдакцыі «Звязды» і падшэфнай авіячасці —працаваў за ўсю.

— Ёць кантакт!—Здавалася, гучалі сотні бяспёрых весёлых галасоў.

— Слова даецца...—адчаканіў і зрабіў паўзу старшыня. І калі шум пачаў сціхаць, працаў:

— Парашутысту тав. **БАБІЦКАМУ.**

Побач са мною ўстаў з-за стала стройны чалавек, трошку вышэй сярэдняга росту, з хуцкаватым маладым тварам.

Проста, спакойна, некалькі саромячыся той надзвычайнай увагі, якая ім пайшла гул сёкора, пачаў расказваць парашутыст Бабіцкі...

Але ў гэтай прастаце і непасрэднасці, з якімі расказваўся клубок складных перажываняў чалавека, што 24 разы пакаў камнем з вышыні тысяч метраў,—была ўся сіла расказа.

* * *

У небе совецкіх рояць сталёвыя птушкі. Чорныя камочкі адрываюцца ад самалётаў і камнямі ляцяць уніз, пакорныя закону Н'ютона. 53-55 метраў у секунду... Гэта—лётка. Гэта—парашутысты...

Разаб'юцца? Не!

— Не можа не распусціцца совецкі парашут,—катэгарычна заяўляе тав. Бабіцкі.

А калі распраецца парашутыст і не тузане за кольца?

— Павінен тузануць,—упэўнена кажа Бабіцкі...

Расхінтнелі на блакітнай эмалі неба белыя маскі... Парашуты распусціліся. Значыцца парашутысты тузанулі за кольцы...

Гэта—малюнак будзіў Бабіцкага. Ён—майстра парашутнай справы, інструктар, начальнік парашутнай службы.

— Спускаюся і я... Адчуў рывок. Значыцца ўзяўся нада мною белы купал. Сачу за таварышамі—адзін, другі, трэці, чацвёрты... Усе ідуць, як трэба да зямлі... Ды значай і быць не можа!..

У спакойных словах Бабіцкага непахісная ўпэўненасць:

— Не можа не распусціцца совецкі парашут! Не здасць наш парашутыст...

І задорам заіскрываюцца вочы парашутыста Бабіцкага.

— Ды які чорт будзе прыгаць днём, калі гэта прыдзецца рабіць на вачах працаўніка. Хачу зацяжным і... ноччу!..

* * *

Сваё жаданне тав. Бабіцкі выканаў. Начным зацяжным прыжкам ён паставіў совецкі рэкорд.

Гэта апраўдвае наша заданне больш падрабязна расказаць пра прой дзены шлях, пра перажыванні парашутыста Уладзімера Грыгор'евіча Бабіцкага.

... На гэты раз мы спаткаліся з ім зусім у іншых умовах. На стале ляжалі скруткі парашутаў...

Звычнай умелай рукою перацінваў т. Бабіцкі розныя праз чахол парашута.

— Прызначэнне гэтых шнуркоў—расцінаць чахол.

Лінкі падвесной сістэмы на працягу секунд кідаліся на плечы, падхватвалі ногі, падвяразвалі гібкую пругкую пазасіпу.

— Бачыце, як размяркоўваецца лямкамі сіла рыўка, якую прымае парашутыст у момант расцінання парашута.

— А вялікая гэта сіла?

— Гледзячы ад таго, наколькі вялікая зацяжка прыжка... Ад 500 кілаграмаў і да тоны...

І зусім робіцца яснае, што гэтая сіла разламала-б хрыбет, калі-б прышлося толькі на адну нашую лямку.

— А вось гэта кольца, за якое трэба тузануць, калі не хочаш, каб сіла рыўка была замененна яшчэ большай сілай удара аб зямлю. Механіка простая,—тлумачыць мне, як навучку т. Бабіцкі,—кольца непасрэдна выцягвае шпількі. Пружына выцягвае выцяжны парашуцік, а за ім выходзіць купал парашута і цягнуцца з сотаў стропы...

Або вось кольца выцягвае шпількі праз трос... Як бачыце, гэта не аўтама тычны, а проста механізаваны парашут. І пры тым пашага совецкага выраба. Трэба толькі тузануць за кольца, а ўжо ён не падвядзе. Ніяк не можа не распусціцца... Жыццё толькі ў сваіх уласных руках. Не трэба быць вялікім героем, а проста не замяшацца і любіць тую справу, якая табе даручана.

— А ўсё-ж такі перад прыжкамі хлопцы трошкі для смеласці напіваюць?—пытаюся я ў т. Бабіцкага.

— Не! Катэгарычна забараняю. І доктар абавязкова правярае. Хочаш прыгаць, не пі,—гэта маё правіла...

* * *

Падаўна стаў прыгаць т. Бабіцкі—у лютым месяцы гэтага года,—а на працягу яго жэтон—распушчаны парашут і эмізу прывеска—«25».

— Гэта вялікая гапаровая ўзнагарода,—кажа т. Бабіцкі.

Усяго зроблена ім 27 прыжкоў, з якіх 10 было зацяжных. Два былі зроблены ноччу, а адзін начны быў з зацяжкай на 900-1.000 метраў...

... Калі роў матора на самалёце пачынаў, што парашутыст адрываўся ад самалёта і, злачыцца, камнем праразае змрок ночы, ніхто не ахнуў, ні охнуў уніз. Толькі спакойна і дзелавіта была зроблена таварышамі на старце засечка часу. Калі раздаўся падобны стрэлу хлапок парашута, была зроблена другая засечка... Успыхнуў зеленаваты агеньчык і пакінуў павоці ўніз... Агеньчык быў спатканы кароткай дзелавітай заўвагай:

— А добра, што запаліў электрычны ліхтарык.

Жонкі яго, Астры Пятроўны, у гэты час дома не было; ды яна ўжо звыклася з тым, што Уладзімер—парашутыст. А маленькая дачка Ая спа койна спала... А калі-б і не спала, дык усё-роўна не магла-б убачыць са свайго звычайнага пазіфалікага пункта — з пазаконнічка, як ад сталёвай птушкі адрываліся родны ёй цёмны камочак,—каб весела крыкнуць можа ў дзесяты, а мо ў дванцаты раз:

— А вунь мой папа прыгнуў!..

Агеньчык спускаўся на зямлю.

— Я ўстаў, напіўся, сабраў парашут і гайнуў насустрач таварышам. Радасць была ў сэрцы, што за дача выканана...

Спакойна і сцрэмна расказвае пра сваё жыццё парашутыст Бабіцкі. Зусім не адчуваецца, што толькі па дзях паставіў ён совецкі рэкорд начнога зацяжнога прыжка.

— Хто мой бацька? Рабочы. Ён пачынаў сваю «кар'еру» вучнем-слесарам на трасцянскім цукровым заводзе, Харкаўскай губерні, а зараз працуе, як галоўны інжынер цукровага камбіната ў Вінніцкай вобласці. Асветы не мае, а практык вялікі. Член партыі...

Я-ж нарадзіўся ў 1904 годзе. У 1919 годзе скончыў школу другой ступені і паступіў на падзённую работу ў трасцянскі цукровы завод. Потым быў прыняты на сталую пасаду змазчыка і працаваў на заводзе да лета 1923 года.

Быў у аправе, змагаўся супроць банд Махно і Кучарава. Днём працаваў, а ноччу хадзіў супроць бандытаў.

У 1923 годзе быў камандыраваны заводам у кавалерыйскую школу.

У 1924 годзе ўступіў у комсамол.

У 1926 годзе скончыў кавалерыйскую школу і быў прызначан камандзірам узвода палкавой школы.

У 1929 годзе ўступіў у партыю. Выконваў часова абавязкі начальніка школы аднагадзійнікаў.

Ажаніўся. Атрымалася гэта надзвычай проста. Да прыцэла прыехала яго сястра, а да мяне мэл. Я ажаніўся па сястры прыцэла, а ён на маёй.

Бацькі жонкі Астры Пятроўны Рэйст—члены таварыства старых большэвікоў. Ёсць у мяне дачка... Вось і ўвесь мой быт. І нібы сароміцца гэтых дробязей, перакідваць т. Бабіцкі да сваіх далейшых службовых спраў.

— У кавалерыі мсў шмат прызоў і ўзнагарод. Адмоўны ў часе джыгітоўкі палажаў ногі.

Але яшчэ задоўга да гэтага марыў я паступіць у авіацыю. Выпадковы пасёт па самалёце канчаткова выразны гэта пытанне.

— А прызнайся, страшнавата было ў першы раз?

Бабіцкі не ўтойвае:

— Так, калі адрываўся ад зямлі, калаціла ў вачах. Але потым стала весела і радасна. Самалёт рабіў фігуры, лицеў «стрыгучпчым» і «брою юнчым» палётам, а я адчуваў усю лаўпату кацуцця чалавека, якому дазвана лятаць, а яю поўзаць.

— Вам трэба пайсці ў авіацыю,—параіў мне механік—будзеце добрым пілотам.

Стаў прасіцца ў авіячасць. Доўга не адпускалі, але я быў настойлівы.

У 1931 годзе нарэшце ў авіячасць. Школы не кончаў. Быў стажорам, а потым вытрымаў экстэрнам па лётчыка.

Спачатку не павяло. Мая стыхія—паветра, а мяне часовым начальнікам штаба зрабілі. Але гэта было пра доўга...

* * *

— Цяжка зрабіць толькі першы парашутны прыжок,—кажа т. Бабіцкі,—хістаешся. А калі паспрабуеш прыгнуць, дык сораміка потым самога сябе робіцца. Летам 1932 года канчаткова рашыў зрабіць прыжок. Страшнавата было. А тут жонка ўзмалілася:

— Не шкадуеш ты ні мяне, ні дачку...

— Прыжок не адбыўся, а ў гэты час парашутыст Афанасьеў з маім парашутам зрабіў зацяжны на 1.600 метраў з вышыні 2.000 метраў і гэтым паставіў сов

Совецкая дэлегацыя на чале з т. Варашылавым прыбыла ў Турцыю

Заява т. Варашылава прадстаўнікам прэсы

СТАМБУЛ, 26. (БЕЛТА). Анаталійскае агенцтва паведамляе: «Народны камісар па ваенных і марскіх справах Варашылаў зрабіў турецкаму другу наступную заяву: «Уступаючы на зямлю турецкай рэспублікі, я рад перадаць праз турэцкую прэсу шчырае прывітанне ўрада народаў СССР турэцкаму народу і ўраду турецкай рэспублікі. Я глыбока расчулен цёплым прывітаннем, аказаным мне і ўсёй дэлегацыі ўрада СССР, пачынаючы з моманта нашага ўступлення на борт парахода «Ізмір» у Севастопалі. Я надзвычай рад выпаўшаму на маю долю высокаму гонару ўзначаліць дэлегацыю, назначаную ЦВК СССР для адказнага візіта на леташнее наведанне СССР глыбока паважанымі старшынёю савета міністраў Турецкай рэспублікі Ісмет-пашой і міністрам замежных спраў Тэфік Рушдзі-бея, і для таго, каб прынять удзел ва ўрачыстасці святкавання 10-годдзя вялікай турецкай рэспублікі. З вялікім задавальненнем я прыняў на сябе гэту задачу.

Я шчыраў, што гата дасць мне магчымасць асабіста прынесці віншаванне прэзідыума турецкай рэспублікі па повазу дзесяцігоддзя і раздзяліць радасць турэцкага народа ў гэты выдатны дзень. Я і астатнія члены дэлегацыі рады убачыць упаслым вачыма новую Турцыю і азнаёміцца з яе поспехамі ў культурнай і гаспадарчай галінах, за якімі народы СССР сочаць з неаслабнай увагаю і сімпатыяй.

Я асабіста рад магчымасці асабіста сустрэць вялікага правадыра новай Турцыі, многапаважанага прэзідэнта рэспублікі Мустафа Кемаль-пашу і яго выдатнага паплечніка—нашага леташняга госця старшыню савета міністраў Ісмет-пашу, нашага старога друга міністра замежных спраў Тэфік Рушдзі-бея, а таксама іншых дзеячоў новай Турцыі».

СТАМБУЛ, 26. (БЕЛТА). Анаталійскае агенцтва паведамляе: «Совецкія дзяржаўныя дзеячы і іх світа сёння ў 19 гадзін 20 мінут выехалі спецыяльным цягнікам у Анкару. У 5 гадзін дня вакзал і прыбягаючыя да вакзала вулі цы былі запоўнены народам. Вестазое судно, упрыгожанае совецкімі флагамі, даставіла гаварсвых гасцей на набережную Хайдар-паша. Нарком па ваенных і марскіх справах Варашылаў, намеснік наркома па замежных справах Карахан і іншыя члены совецкай дэлегацыі высадзіліся на берег, увайшлі ў вакзал, суправаджаемыя гарачымі апладысментамі і гарачымі прывітаннямі шматлікага натоўпа. Музыка выконвала «Інтэрнацыянал». Прыняўшы парад варты турэцкіх войск, бой скаўтаў і слухачоў ваеннай школы Кулелі, Варашылаў, горача вітаемы прысутнымі, увайшоў у вагон пад бурныя авацыі прысутных. Нарком Варашылаў з'явіўся на пляцоўцы вагона і звярнуўся з прамовай, у якой заявіў: «я прывёз вам шчырыя і гарачыя прывітанні ад народаў СССР». Словы яго былі пакрыты агглушальнымі апладысментамі. Звярнуўшы затым да беспарэчнага апладыраваўшага натоўпа, Варашылаў сказаў: «Я прывёз брацкае прывітанне ад Чырвонай арміі СССР непераможнай турэцкай арміі». Затым Будзённы звярнуўся да турэцкай моладзі з прывітаннем ад імя совецкай моладзі. У 19 г. 20 мінут цягнік адышоў пад бурныя прывітанні прысутных».

НОВЫ УРАД ФРАНЦЫІ

ПАРЫЖ, 27. (БЕЛТА).

Учора сфармаваў габінет у наступным складзе:

Прэм'ер і марскі міністр — **Альбер Сарро** (радыкал-сацыяліст, былы міністр каленій у габінеце Далад'е). Міністр унутраных спраў — **Шотан** (радыкал-сацыяліст, займаў той-жа пост у габінеце Далад'е). Міністр фінансаў — **Бонне** (радыкал-сацыяліст, былы міністр фінансаў у габінеце Далад'е). Міністр замежных спраў — **Поль Бонкур** (сенатар, не належыць ні да якой групы, займаў той-жа пост у габінеце Далад'е).

Ваенны міністр — **Далад'е** (радыкал-сацыяліст, займаў пост прэм'ера і ваеннага міністра ў апошнім габінеце). Міністр земляробства — **Кей** (радыкал-сацыяліст, былы міністр земляробства ў габінеце Далад'е).

Віцэ-прэм'ер і міністр юстыцыі — **Далім'е** (радыкал-сацыяліст, былы міністр каленій у габінеце Далад'е). Міністр бюджэта — **Гарэй** (член сенацкай групы «тэмаратычнай левай», былы міністр земляробства ў габінеце Эрыо). Міністр пошт і тэлеграфа — **Мастэр** (радыкал-сацыяліст, былы таварыш міністра па прыгожых мастацтвах у габінеце Поль Бонкура).

Міністр каленій — **Петры** (член групы «левых рэспубліканцаў», былы міністр нацыянальнай абароны ў апошнім урадзе Тард'е). Міністр гандлёвага флота — **Штэрн** (дэпутат, не належыць ні да якой групы). Міністр гандлю — **Лерош-Зімэн** (член групы «радыкальнай левай», былы міністр пошты і тэлеграфа ў габінеце Далад'е).

Міністр грамадскіх работ — **Паганы** (радыкал-сацыяліст, займаў той-жа пост у габінеце Далад'е). Міністр працы — **Фро** (не належыць ні да якой групы, займаў пост міністра гандлёвага флота ў габінеце Далад'е).

Міністр асветы — **дэ-Монзі** (член групы «рэспубліканскіх сацыялістаў», займаў той-жа пост у габінеце Далад'е). Міністр пенсій — **Дзюко** (радыкал-сацыяліст, былы таварыш міністра асветы ў габінеце Далад'е). Міністр аховы здароўя — **Лісбон** (сенатар, член групы «левай дэмакратычнай»).

Міністр авіяцыі—**П'ер Кот** (радыкал-сацыяліст, займаў той-жа пост у габінеце Далад'е). Стале-сакратар пры старшыні савета міністраў — **Андрэ Мары** (дэпутат, член групы рэспубліканскіх радыкалаў і радыкал-сацыялістаў).

Таварыш міністра замежных спраў — **Франсуа дэ-Тэсан** (радыкал-сацыяліст, таварыш міністра працы ў габінеце Поль Бонкура).

Таварыш міністра па тэхнічнай асвеце — **Маркомб** (радыкал-сацыяліст, былы таварыш міністра па фізычнаму выхаванню ў габінеце Поль Бонкура). Таварыш міністра каленій — **Огюст Бруне** (дэпутат, член групы «незалежнай левай»). Таварыш міністра асветы — **Максанс Вібіэ** (дэпутат, не належыць ні да якой групы).

Таварыш ваеннага міністра — **Ляшамбр** (член групы «незалежнай левай», займаў пост стале-сакратара пры старшыні савета міністраў у габінеце Далад'е).

Таварыш міністра па фізычнаму выхаванню — **Ле-Горжэ** (сенатар, член групы «левай дэмакратычнай»).

Такім чынам, **габінет Альбера Сарро** ў аснoўным **радыкал-сацыялісцкі** (12 міністраў і таварышоў міністраў) і адзначна адрозніваецца ад габінета Далад'е. У габінет Сарро ўваходзіць 14 міністраў і таварышоў міністраў габінета Далад'е.

Па агульнай думцы новы габінет не будзе мець трывалай большасці ў парламенце і з'яўляецца пераходным габінетам да ўрада права-цэнтрысцкай канцентрацыі.

Пры такім складзе габінета ясна, што праграма новага ўрада мала чым будзе адрозніваціца ад праграмы ранейшага. У галіне знешняй палітыкі гэта падкрэсліваецца захаваннем паста міністра замежных спраў за Поль Бонкурам.

ЯК НАРКАМЗЕМ „ПЛАНУЕ"

Дрысенчына — адзін з асноўных ільнаводчых раёнаў БССР. Глебавыя і эканамічныя умовы раёна сапраўды спрыяюць развіццю ільнаводства.

У 1932 годзе ўдзельная вага ільну да ўсёй пасеўнай плошчы раёна складала 18 проц., а ў 1933 г. удзельная вага ільну ўжо складае без саўгасаў 19,6 проц. Гэты процант па асобных сельсоветах хістаецца ад 16 (Росіцкі сельсавет) да 23,4 (Каркапецкі сельсавет). Калі прааналізаваць гэты паказальнік у разрэзе кожнага калгаса, то тут мы атрымаем такія лічбы:

Калгас імя Карла Маркса: пасеўплошча ільну — 33,2 проц.;

Калгас «Іскра» — пасеўплошча ільну — 30,0 проц.;

Калгас імя Сталіна I — пасеўплошча ільну — 28,3 проц.;

Калгас імя Сталіна II — пасеўплошча ільну — 30,0 проц.;

Калгас імя Войкава — пасеўплошча ільну — 27,3 проц.;

Калгас «Гігант» — пасеўплошча ільну — 26,6 проц.

Такіх прыкладаў можна прывесці цэлыя дзесяткі. Яны яшчэ раз пацвярджаюць, што ў сельгасвароты калгасаў лён з'яўляецца вядучай культурай.

Уся ўвага раёна, партыйнай арганізацыі і палітаддзела МТС была звернута на тое, каб не толькі пасеяць лён, але выканаць і ўсе наступныя працэсы — пракоўку, першачарговую апрацоўку і своечасовую здачу высокаякаснай ільнапрадукцыі дзяржаве.

На аснове шырокай палітычна-масавай работы сярод калгаснікаў і адназасобнікаў наш раён сапраўды дабіўся лепшых паказальнікаў у БССР.

Калгаснікі ўдорна правялі пракоўку. Першачарговая апрацоўка ільну праведзена палепшаным, так званым «пскоўскім спосабам». Дзякуючы правільнай арганізацыі працы ў калгасах, пырокаму ўкараненню сацыялістычных метадаў у работу — соцспаборніцтва і ўдарніцтва наш раён здаў 45,4 проц. ільнапрадукцыі, якая прылічваецца з яго. Асобныя сельсоветы выканалі гадавы план.

Дзержавіцкі на 91,2 проц., Луначарскі — 82,4 проц., Вальшэнскі — 78,7 проц., Боркавіцкі — 65,2 проц. і г. д.

Есць дзесяткі калгасаў, поўнасцю выканаўшых гадавыя планы. Так, напрыклад, калгасы «Пераможца», «Верны шлях», «Новая культура», «Змех», «Другая пяцігодка» поўнасцю выканалі кантрактацыйныя дагаворы, здалі на загатоўчыя пункты высокаякасныя ільнавалакно і тэрсту. Рэспубліканская камісія па соцспаборніцтву з Заходняй вобласцю пастанавіла на групе ільнаводчых раёнаў перадаць пераходны чырвоны сцяг імя ЦК КП(б)Б і СНК БССР Дрысенскаму раёну.

Усе вышэйпаказаныя факты яшчэ раз пацвярджаюць правільнасць акрэслення спецыялізацыі нашага раёна, як ільнаводчага, дзе лён сапраўды з'яўляецца вядучай культурай.

Наркамзем БССР у ўзгодненых ім схемах сельгасвароты для ільнаводчых раёнаў прапанаваў адводзіць пад лён лепшыя ўгноеныя ўчасткі, есць лён па лепшых папярэдніках. Усё гэта абавязвала плануючыя кіруючыя органы БССР і Наркамзем у першую чаргу пры давядзенні пасеўных планаў улічваць асаблівасці і спецыялізацыю раёна. Што-ж атрымлівалася на справе?

У 1932 годзе «Правда» і «Звязда» пісалі ўжо аб тым, як Наркамзем «даводзіў» планы нашаму Дрысенскаму раёну.

Не змянілася становішча і ў гэтым годзе. Ды давядзенні планаў азімай сяўбы Наркамзем устанавіў для Дрысенскага раёна блытаны, недакладны план. РК КП(б)Б і райвыканком некалькі раз зварачаліся па гэтаму пытанню ў Наркамзем. Але дарэмна. Наркамзем настойваў на сваім — сейце і ўсё, разважаць будзем потым. Гэта прывяло да таго, што пераважная большасць калгасаў вымушана была парушыць устаноўленыя севазвароты і апрача таго рабіць пасеў жыта на такіх папярэдніках, як лён 1 узёс, а гэта значыць нанесці рашучы ўдар па ўраджайнасці. Апрача таго, пасевы на гэтых плошчах прыходзіцца рабіць у позніх тэрміны пасля ўборкі яравых.

Што датычыць севазваротаў, то цяпер прыходзіцца брацца за гэту работу нанава. Але ці надоўга? Ці не да атрымання новых планаў?

Начальнік палітаддзела Дрысенскай МТС ПЛАЎНІК.
Загадчык райземаддзела САВОСТАЎ.

АД РЭДАКЦЫІ: Чакаем ад Наркамзема БССР неадкладнага рэагавання на закранутыя ў даным артыкуле пытанні.

Напярэдадні 16-й гадавіны Кастрычніка

У КЛУБАХ

МЕНСК.

Рабочыя КЛУБЫ МЕНСКА рыхтуюцца да 16-й гадавіны Кастрычніка. Яўрэйская мастацкая агітбрыгада клуба імя СТАЛІНА падрыхтавала пастаноўку «Ноч». Тэма — барацьба за паляпшэнне якасці прадукцыі і знішчэнне брака на менскім хлебакамбінаце. Клуб імя Сталіна выпучыў 22 гурткоўцаў для аказання дапамогі прадпрыемствам харчовай прамысловасці ў правядзенні свята.

5-га лістапада ў Менску склікаецца КАНФЕРЭНЦЫЯ ЛЕПШЫХ УДАРНІКАЎ ПРЫЛАЎКА. Клуб імя VII з'езда прафсаюзаў рыхтуе да канферэнцыі чырвоную дошку лепшых дзяржаўна-гандлёвых арганізацый у барацьбе за поўнае і датэрміновае выкананне гандальфінплана. Арганізуецца фота-вітрына лепшых ударнікаў прылаўка. 7-га і 8-га лістапада ў клубе — дзіцячыя ранішнікі.

Клуб кааперацыі інвалідаў у дні кастрычніцкіх свят наладжвае культпаходы членаў інвалідных арцеляй у музеі, тэатры і падшэфную чырвонаармейскую часць.

Зусім не вядзе работы па падрыхтоўцы да свята клуб друкарні імя Сталіна (загадчык тав. Баскін). Фабком друкарні не аказвае клубу ніякай дапамогі.

С. Ш.

ЗЛЁТ УДАРНІКАЎ ЯКАСЦІ

1-га лістапада ў Менску адбудзецца ГАРАДСКІ ЗЛЁТ УДАРНІКАЎ ЯКАСЦІ і герояў аўладання тэхнікай. У рабоце злёта прымуць удзел 800 дэлегатаў. Адкрываецца выстаўка вытворчых дасягненняў. Пачынаецца масавы збор на прадпрыемствах рацыяналізатарскіх прапаноў. Лепшаму калектыву будзе перададзен чырвоны пераходны сцяг.

НОВЫЯ ЯСЛІ

На будаўніцтве ЦЗЦ, на швейнай фабрыцы імя Крупскай і на шчотачнай фабрыцы да 7-га лістапада адкрываюцца НОВЫЯ ЯСЛІ.

СУСТРАКАЮЦЬ КАСТРЫЧНІК НОВЫМІ ПЕРАМОГАМІ

РАГАЧОЎ. (Па тэлеграфу).

Рабочыя і калгаснікі Рагачоўшчыны сустракаюць кастрычніцкае свята новымі перамогамі на фронце сацыялістычнага будаўніцтва.

Калектывы лесазавода і кардоннай фабрыкі піквідуюць прарыў у выкананні прамфінплана. Штодзённае заданне перавыконваецца.

Рабочыя і камсамольцы МТМ выпускаюць з рамонта ЗВЫШ ПЛАНА ТРАКТАР.

Калгаснікі калгасаў «Чырвоная армія», «Праўда» падрыхтоўваюць жывёле сытную і цёплую зімоўку. Паміж калгасамі МТС разгортваецца ўзаемная самаправерка падрыхтоўкі жывёлы да зімоўкі. У калгасе імя Калініна да кастрычніцкага свята РАДЫЁФІКУЮЦЦА КАЛГАСНЫЯ ХАТЫ. У Азяранскім і Свяржанскім сельсоветах заканчваецца пабудова НОВЫХ ШКОЛ.

ВЯРХОЎСКІ.

БРАЦЬ ПРЫКЛАД З ФАБРЫКІ „Х КАСТРЫЧНІК"

РЭЧЫЦА. (Наш кар.).

Запалкавая фабрыка «Х Кастрычнік» у РЭЧЫЦЫ паказвае ўзор добрай падрыхтоўкі да кастрычніцкіх свят. Прамфінплан па экспарту за першую дэкаду кастрычніка выкананы на 105 проц. Пры дапамозе трыкутнікі фабрыкі «Х Кастрычнік» склікана канферэнцыя рабочых фанернага завода, які да апошняга часу адставаў у выкананні вытворчых заданняў. Пасля канферэнцыі фанерны завод падцягнуўся і цяпер ён прамфінплан па экспэрту перавыконвае.

Створана спецыяльная камісія па паляпшэнню снабжэння рабочых. Загатоўлены цукар, масла, мяса, гародніна, бульба. Рабочыя з поспехам правялі суботнік па ўборцы бульбы і гародніны ў сваім калгасе.

Склікаецца канферэнцыя ўдарнікаў па ўшчыльненню рабочага дня. Па цэхах разгортваецца спаборніцтва на атрымане права паехаць на ўсебеларускі злёт ударнікаў якасці і на канферэнцыю запалкавай прамысловасці, якая адбудзецца 1-га лістапада ў Барысаве.

Рэчыцкі райпрафсавет замест узначальвання ініцыятывы прадпрыемстваў фактычна стаіць у баку ад гэтай важнейшай работы.

ДАШКЕВІЧ.

СТАЛОЎКА НА 3.000 АБЕДАЎ

На заводзе «ЧЫРВОНЫ МЕТАЛІСТ» у ВІЦЕБСКУ да 16-й гадавіны Кастрычніка адкрываецца НОВАЯ СТАЛОЎКА, якая будзе адпускаць 3.000 абедаў у дзень.

На Барысаўскім дрэваапрацоўчым камбінаце «Камінтэрн», на мазырскім лесапільным заводзе «Пролетарый», на дрэваапрацоўчым заводзе імя Молатава ў Менску заканчваецца пабудова раду новых дамоў для рабочых. (БЕЛТА).

КАЛГАСЫ РЫХТУЮЦЦА ДА СВЯТА

ПОЛАЦАК. (Наш кар.).

Палітаддзел Полацкай МТС разгарнуў масавую работу на лепшую падрыхтоўку калгасаў да кастрычніцкіх свят. Свята адзначаецца адкрыццём новых культурна-бытавых устаноў. У калгасе імя Лекерта адкрываецца клуб, у калгасе імя Сталіна — новыя яслі. Некаторыя калгасы электрыфікуюцца.

Калгасы, якія выканалі свае абавязкі перад дзяржавай па здачы сельгаспрадукцыі і паспяхова размеркавалі ўраджай, пасылаюць брыгады ў дапамогу адстаючым. Такія-ж брыгады накіроўваюцца ў Дрысенскі раён, з якім спаборнічае Полаччына.

Л. ФРЫД.

Пастанова менскага гарадскога совета

У сувязі з святкаваннем 29 кастрычніка г. г. 15-ГАДОВАГА ЮБІЛЕЯ УСЕСАЮЗНАГА ЛЕНІНСКАГА КОМУНІСТЫЧНАГА САЮЗА МОЛАДЗІ, прэзідыум гарадскога совета ПАСТАНАВУЛЕ:

Абавязаць усіх кіраўнікоў жактаў, устаноў і прыватных домаўладанняў да 8 гадзін раніцы 29 кастрычніка г. г. упрыгожыць свае домаўладанні сцягамі.

Гандлёвым арганізацыям упрыгожыць вітрыны сваіх магазінаў.

Старшыня Менсовета КАРАНЕЎСКІ.
Сакратар Менсовета КАПІЛЕВІЧ.

27 кастрычніка 1933 г.
г. Менск.

ПАВЕДАМЛЕННІ

Менгарком КП(б)Б паведамляе, што наступныя таварышы вылучаны кіраўнікамі ПАЛІТДНЯ ПА ПЫТАННЯХ МІЖНАРОДНАГА СТАНОВІШЧА, які згодна пастановы гаркома КП(б)Б праводзіцца 30-га КАСТРЫЧНІКА і 1-га ЛІСТАПАДА.

Усе таварышы павінны зараз-жа зая заца з прадпрыемствамі, куды яны прымацаваны. Інструкцыйная кансультацыя для таварышоў адбудзецца 29-га КАСТРЫЧНІКА, У 7 гадз. вечара, У ПАМЯШКАННІ МАЛОЙ АЎДЫТОРЫІ ДОМА КОМАСВЕТЫ (уваход з вул. Карла Маркса).

БРАГІНСКІ («Звязда»), АГУЛЬНІК (ВКСГШ), КАЧАТКОЎ (ДПУ) — завод імя Варашылава; ЗЛОТНІК (ЦК КП(б)Б) ЯНОЎСКІ (райвыканкам.) — завод «Комунар»; ШАСТАКОЎ («Калгаснік Беларусі», ГЕРАФКЕР (ЦК КП(б)Б — завод «Большавік»; ЗУСКОЎ (гістпарт), КАСТРУЛЕЎ (НКСнаб) — завод імя Молатава; АЎЧЫННІКАЎ (ВКСГШ) — фабрыка «Кастрычнік»; КУДЗЕЛЬСКІ (НКЮ) — шклозавод; ПІНХАСІК (Загат лён) — фабрыка «Комунарка»; КАЛУГІН (АДПУ) — хлебазавод; ВАЛАБРЫНСКІ (БАН) — шчотачная; СЛОНІМ (НДІ прам.) — друкарня імя Сталіна; АЎЧЫННІКАЎ (свіназаводтрэст) — мясакамбінат; ФРЫДМАН (СНК) — скарняжная фабрыка; ФРЫДЛЯНД (ЦК КП(б)Б) — фабрыка «8 сакавіка»; КУЦІН (АДПУ) — фабрыка «Ўсход»; ЛОЙКА (ВКСГШ) — спіртазавод; ЛЕВІТЭ (ЦКК) — хімфармзавод; ГОЛАНД (Наргасупік) — «Чырвоны хімік»; УЛАЗА (НКА) — завод «Пролетарый»; ІОФЕ («Звязда») — «Чырвоны золак»; ЛЮБІН (Дом комасветы) — фабрыка імя Фрунзе; БОГАРАД (ЦП грам. харчавання — «Чырвоны тэкстыльшчык»; ГУРВІЧ П. (БІМЗО) — шпалерная фабрыка; КЕЙЛІН (камунбанк) — лямцавая фабрыка; СІЭКС (ДПУ) — Эльвод; РОЗЕНГАУЗ (Камунбанк) — абуткова фабрыка; ФІШБЕЙН (рэд. «Рабочий») — абуткова фабрыка; БЕР (рэд. «Аксцябр») — фабрыка імя Тэльмана; АБРАМАЎ (НКЮ) — фабрыка імя Крупскай; ФАЙНГАУЗ (ЦП тарфянікаў) — ЦЗЦ; БОБРЫК (БелАН) — групком харчавікоў; МЫШАЛАЎ (ЦП саюза кааперацыі і дзяржгандля) — завод малочных ніспот; БАРАН (БІМЗО) — малочны завод; ЖУРОМСКІ (Загатзерне) — УЭА; СПЕКТАР (СНК) — Б[illegible]; БЕЛКІНД (НКЮ) — ФЗМК; ВЫ[illegible] (ВСКГШ) — трактарныя майстэрні; КАБАКОЎ (ЦСПСБ) — зав. панцугоў «Гелля»; ВАКСМАН (БКС) — арцель «Чырвоны абутнік»; БРЫСКІН (Белпрамсовет) — арцель «ДА»; НЕМЕЦ (Гістпарт) — арцель «Чырвоны металіст»; ЛЕВІН (Гістпарт)—арц. «Пролетарый»; ЖУКАЎ (ЦК КП(б)Б) — арцель імя Крупскай; КАНАПЛІН (гарпракуратура) дэпо паравозное; ЛЯХАЎ (НКФ)—дэпо вагоннае; САЕВІЧ — зав. імя Мяснікова; ДЖЭЛЮК («Звязда») — служба шляха; ЛЕБЕДЗЕЎ (рэд. «Чырвоная змена») — служба эксплаатацыі; ЖАРОЎ К. Д. (СНК) — ДЗ-6; ГАНЧАРОЎ (СНК) — Саюзтранс; ЦЫНІК (ДПУ) — трампарк; КРАЎЧУК — Белдзяржбуд; КАЛАСКОЎ (ДПУ) — Менбуд; МАТУСЕВІЧ (СНК) — Дом урада; ЗАДЗЕРНЮК (ЦК КП(б)Б) — Водаканалтрэст; ДАВІДОВІЧ (НКА) — першы групком будаўнікоў; ЛЯЎКОВА (Гістпарт) — зав. стандартных дамоў; АДЗІНЕЦ (ЦК КП(б)Б) — цагельня № 1; БАШКЕВІЧ (НКА) — цагельня № 1-3; КЛІМАЎ (ЦК КП(б)Б) — цагельня № 2-4; ШУСТЭРМАН (Наркамлёгпрам) — цагельня № 4; АЛЯС (Дом комасветы) — цагельня № 5-6; ЦІШКО (Дом комасветы) — цагельня № 8; ГАЛАСКОК (НКЮ) — Белкамунбуд; НІСЕНБАУМ (НКАЗ)—ячэйка паліклінікі і ясляй.

НАСТУПНЫЯ ТАВАРЫШЫ ТАКСАМА ПАВІННЫ З'ЯВІЦЦА НА КАНСУЛЬТАЦЫЮ І БУДУЦЬ НАКІРАВАНЫ НА ПУЦЁЎКАХ ГАРКОМА КП(б)[illegible]:

ДУБІНА (ЦС Асоавіяхіма); ДЫ[illegible] (гарсовет ААХ); ЗАХАРАВА (ЦП сая[illegible] фінбанкаўскіх работнікаў); ЕЛЕНЕ[illegible] (гарфа); ГОЛЬДМАН (ЦК ЛКСМБ); АЎГУСТАЙЦІС (ЦК ЛКСМБ); КАМАРОЎ (ЦК ЛКСМБ); СКУМАН (БелАН); ГУРСКІ (БелАН); РЫЎКІНД (НКЮ); СЫЦЬКО (БелАН); ГАЛКІН (Белдзяржкіно); ІВАНОЎ (Галоўдартранс); ЛЫСОЎ (энергаінстытут); СТРАКОЎСКІ (Наргасупік); ДУНЕЦ (Наркамасветы); РУДЗІЦКІ (Саўбуд); АГУРСКІ (ГІСТПАРТ); ПЯЧОНКА (ЦК КП(б)Б); ГУРЛО (планава-эканамічны інстытут); МАНАЎ (фін. інстытут); ІВАШЧАНКА (фінінстытут).

Рэспубліканская камісія па чыстцы КП(б)Б паведамляе, што 31 кастрычніка ў ДРЫСЕ, 1-га і 2-га лістапада ў ПОЛАЦКУ, 3-га лістапада ў УШАЧАХ і 5-га лістапада ў РАСОНАХ будзе засядаць рэспубліканская камісія па чыстцы на разгляду апеляцый наступных таварышоў:

31-га кастрычніка ў ДРЫСЕ:

Шчэрбіцкага А. І., Сантаровіча Л. А., Шыманскага С. Я., Спіцынава І. Т., Шылко П. Г., Метлюка І. І., Буланчыка В. М., Рудога І. Н., Будзіна М. А., Шыманскага Б. Ф., Станкевіча П. С., Мельнікава А. П., Грэчкіна А. І., Савіцкага К. В., Гольмана М. А., Кабылінскага К., Ціханава О. Ф., Бейлінсона І. Н., Гарбенцкага С. В., Кажушкевіча А. Г., Ашурка Э. Л., Арлоўскага С., Падлавай Е. Г., Скроба Н. Л., Рохліна І. М., Новікава, Жук М. А, Жука І. І., Карпаухава М. М., Ластоўкі С., Дагель Л. П., Шкляра М. Г., Мяленка Х. І., Пажкрат'ева А. К., Гусьмана А. Г., Урбана В., Кавалешка І. О., Давыдава Ф., Гуцымава В. П., Бобрыкава Я. Л., Шатуна В., Сведзіна С. І., Васілеўскага А. Е., Ганулевіча І. І., Капялюшнікава Д. Е., Будзіка А. К., Сапкевіча В. С.

1-2 лістапада — у ПОЛАЦКУ:

Бабароўскага І. П., Клімава І. М., Крыцкага А. Н., Свэйцкай А. Я., Вікса Э. К., Левіта С. В., Камінскага Я. І., Бабароўскага А. В., Нікіфарава А. А., Шэнцеля А. М., Бінакурава Н. П., Марозава П. В., Масленікава П. І., Славяна Д. Н., Федзенка Я. М., Шмідт О. І., Шарманава В. С., Касцючэнка І. С., Бамуцкіна І. М., Сердзіна М. І., Рабусіка Ф. Е., Гофмана Б. С., Вішнеўскага Я. А., Цішаловіча С. М., Клісіна А. Х., Казінка А. Н., Чыбырава М. В., Альпцулера І. М., Гарошчанка А. С. Фарэмана М. З., Браймана Б. Д., Жукавай Ф. Ф., Эбрыля Л. М., Пірога І. Я., Шэрыкава К. М., Пейсахава Н. А., Барановскага М., Зайцава М. І., Ігаско Ф. Г., Пінкіна С. М., Немчынава С. І., Зельбота Р. С., Шупейка П. П., Малкіна А. І., Булышіна Ф., Барбашынай А., Буевіча З. Я.

3-га лістапада — ва ЎШАЧАХ:

Найдукова А. Г., Петухова М. С., Міхеля Р. М., Гінзбіна М. Г., Апенка П. А., Азевіча П. В., Сынкевіча Ф. П., Голая В. Н., Вашука Я. А., Гушчэра І. А., Пароменскага М. Ф., Пашко А. Л., Стуцко Ф. М., Каробава І. І., Качанова Ф. І., Гінзбіна С. Г., Волкава І. С., Авдзіпёва Р. П., Амбросенка Р. Н., Шчэрбікова П. С., Шэхтмана М. М., Шахнеўскага А. П., Дзенісенка К. Н., Чумакова І. К., Прыстаўка П. М., Раўбэ С. І., Данцорка І. І., Барановскага Э. А., Вайткевіча Б. К., Карбаленіча М. Ф., Іофэ З. А., Котава І. Ф., Тарасевіча М. А., Петрышча С. Н., Петрышча А. Н., Сямёнава М. І., Чубатава А. В., Харэнка К. М., Пізан А. Ф.

5-га лістапада ў РАСОНАХ:

Пек М. Г., Подзена П. С., Бураковa А. Н., Дзянісава Г. Н., Тальвінскага М. Л., Бурчасенка А. Ф., Фамлюка І. І., Мяжэйка Н. В., Чарнышова К. К., Сівіткова А. В., Голыдмана С. Б., Валькова І. Я., Арлова Г. С., Ефрэменка С. А., Трафімава Г. Ф., Каралешка І. Е., Ворсаўчыка В. Ф., Багданава Л. С., Куракова П. Ф.

Рэспубліканская камісія па чыстцы КП(б)Б.

Рэспубліканская камісія па чыстцы КП(б)Б паведамляе, што 29 і 30 кастрычніка 1933 г., у 10 гадзін раніцы, у Оршы будзе засядаць рэспубліканская камісія па чыстцы па разгляду апеляцый на пастановы горацкай і аршанскай раённых камісій наступных т. т.:

НА 29 КАСТРЫЧНІКА, НА 10 Г. РАНІЦЫ, У ОРШЫ (ГОРАЦКІ РАЁН)

Баронава А. Е., Рыскіна З. Х., Курынава Е. Н., Палцера Х. М., Калуцкага С. В., Плошкіна П. А., Клімава Д. І., Быкава В. В., Левінай С. Я., Варанцова І. М., Сырамолатава М. Я., Бурдынюка П. А., Палявога А., Сарокіна П. С., Ральчыка К. М., Тарасава А. П., Емельянава В. П., Сенькевіча С. М., Шатон А. Ф.

НА 29 КАСТРЫЧНІКА, НА 6 Г. ВЕЧАРА, У ОРШЫ (АРШАНСКІ РАЁН)

Бурэкага Н. Е., Красноўскага Л. І., Бакуновіча К. І., Кавалюка Б. А., Дзержыцкага П. В., Рыцікава Н. І., Ларыонава Р. А. Шапавалава Я. П., Семашка А. К., Зарэцкага П. М.

НА 30 КАСТРЫЧНІКА, НА 10 Г. РАНІЦЫ Ў ОРШЫ (АРШАНСКІ РАЁН).

Грынберга К. І., Маслоўскага Б. Ф., Лугаскера М. І., Хацеева В. Т., Макарэнка П. В., Васількова І. Ц., Кадраўцова П. І., Транзенок П. П., Спапкоўскага І. Я., Шачыкава А. І., Халецкага А. А., Кувекіна А. К., Кутневіча А. С., Кубракова С. І., Жылінка З. М., Камлача А. А., Барцова Л. А., Лісоўскага І. К., Руфа Ф. В., Лісоўскага В. Я., Шпака Ф. Я., Тураўца М. Л., Казлова А. К., Кавалеўскага П. П., Гросканц Ю. Ф., Пашкевіча К. І. Макарэвіча П. С., Дамарацкага І. І., Гародніка В. В., Ермачэнка Е. Ф., Азарэнка Н. П., Талаш[illegible] С. Х., Стасюкевіча А., Годзіна С. А., Мікоўскага Н. А., Сакалоўскага Л. С., [illegible]скова К. Т., Маяковіча С. Н., Тушкага [illegible] М., Янкоўскага П. Т., Ракава І. М., Самароўскага В. М.

Рэспубліканская камісія па чыстцы КП(б)Б.

ПК ЦКК КП(б)Б просіць тав. Раеўскага С. І., працаваўшага ў Мсціслаўскай арганізацыі, т. Ігнацьева Рыгора Дзімітрэвіча, працаваўшага раней у Мсціслаўскім раёне, т. т. працаваўшых раней у Віцебску — Лявонава Сцяпана Канстрэтава, Васуля Пятруся Архіпава, Лапеца Нікапая Фаміча, Хлусевіча Уладзіміра Ніфіфаровіча, Рыжынава З. Я., Сямёнава Нікапая Панцялеева, Башкатова Трахіма Аўрамава, Лапацюка Мірона Карнілаве, Масарава Макара Хведарава, Полкова Філіпа Цімафеева, Кулышова Яўгена Нікалаева, Кобленца Лейзера Гедэйлава, Жураўлёва Івана Рыгорава, Паўлікава Алеся Сямёнава, Паткова Рамана Філіпава, Шпіро Соню Вульфаўну, Сверма Алеся Станіслава, Шпакоўскую Палагею Васільеўну, Соцкага Івана Нікалаева, Гаршкова К. Ф., Белячыкава Пятра Паўлава, Аршаўскага Пімена Фёдарава, Егоркава Алеся Нікалаева, Пакроўскага Барыса Алеся, Суханава Пятра Іванава, Павілайціс Кацярыну Осіпаўну, Казака Уладзіміра Осіпава, Ялбакова Івана Іосіфава, Вярбіцкага Паўла С., Яневіча Івана Іванава, Панко Алеся Архіпава, Масліўскага Гаўрылу Васільева, Шугадаву Алесю Данілаўну, Рагайціса Пятра Усцінава, Ягораву Афрасінню Сяргеўну, Шаўрукова Н. Н., Міцкевіча Пятра Міхайлава, Рагажынскую Афрасінню Лявонаўну, Прусакова Рыгора Сцяпанава, Бенішава Івана Маркава, Зуева Алеся Рыгорава паведаміць ПК ЦКК (Менск, Совецкая 55) адрас аб месцы работы і жыхарства без выезда ў Менск.

Просьба да ўсіх партарганізацый, ведаючых аб месцы знаходжання паказаных таварышоў, паведаміць аб гэтым ПК ЦКК.

ПАРТКАЛЕГІЯ.

ПК ЦКК КП(б)Б паведамляе, што 1-2-3 лістапада т. г. у г. Віцебску будзе працаваць выязная парткамісія ЦКК КП(б)Б па разгляду партспраў Віцебскага, Суражскага, Лёзненскага, Гарадоцкага раённых наступных таварышоў.

ПА ВІЦЕБСКАМУ РАЁНУ НА 1-2 ЛІСТАПАДА.

Сарабей Н. А., Дзерабін А. І., Гоз Г. Д., Шараў І. Г., Паўлёнка М. Р., Абраменка, Будчэнка І. І., Скарынкаў М. С., Комель К. І., Пчэльнікаў У. П., Селіванаў А. А., Карпаў Я. У., Конікаў П. З., Конаў П. К., Грахоўскі-Гарбікоў М. Д., Сударын Н. Ц., Егораў Т. Н., Баркоўскі К. Я., Казіміраў Р. Н., Рыўкін Х. Ш., Гаргзееў М. Дз., Мула І. Н., Кітчанка А. Л., Трахаў А. П., Доўгі І. Ф., Варанілаў К. О., Салокін Н. П., Новікаў, Птушкоўскі В. А., Пушкароў В. Н., Чыжоўкін А. А., Каралін І., Сромін В. Ф., Гімпельсон З. Б., Шмукл